МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ

ДЛЯ ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

# СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## V–XI класы

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2012

УДК 373.121.414:373.5:94
ББК 74.266.3
В90

ISBN 978-985-559-081-2

© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2012
© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне гісторыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на ўзроўні агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі. У адпаведнасці з асобасна арыентаванай парадыгмай сучаснай адукацыі вывучэнне гісторыі як навучальнага прадмета арыентавана на фарміраванне ў вучняў якасцей асобы, неабходных для выканання агульных для ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь сацыяльных функцый, абумоўленых сістэмай каштоўнасцей, агульнапрынятых у беларускім грамадстве.

**Мэты** гістарычнай адукацыі:

- авалоданне вучнямі асновамі сістэматызаваных навуковых ведаў, адаптаваных да іх узроставых пазнавальных магчымасцей, аб найважнейшых падзеях, з'явах, працэсах, тэндэнцыях і заканамернасцях сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі ў іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці;
- інтэлектуальнае выхаванне, развіццё творчасці, наватарства, ініцыятывы вучняў;
- далучэнне вучняў да дасягненняў айчыннай і сусветнай культуры;
- фарміраванне каштоўнасных арыентацый вучняў на аснове ідэй гуманізму і стваральнага патрыятызму, прынцыпаў грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы ў адпаведнасці з асновамі ідэалогіі беларускай дзяржавы.

**Задачы** гістарычнай адукацыі:

- засваенне вучнямі асноўных факталагічных і тэарэтычных ведаў аб найважнейшых падзеях, з'явах, працэсах, тэндэнцыях і заканамернасцях развіцця грамадства, аб асаблівасцях развіцця асобных краін, цывілізацый і рэгіёнаў;
- фарміраванне цэласнага ўяўлення пра месца і ролю Беларусі ў сусветна-гістарычным працэсе, усведамленне вуч-

нямі своеасаблівага шляху беларускага народа, выхаванне пачуцця адказнасці за яго далейшы гістарычны лёс;

- асэнсаванне вучнямі своеасаблівасці культур народаў свету, самабытнасці культуры беларускага народа, фарміраванне ўмення шанаваць культурную разнастайнасць, разумець і паважаць каштоўнасці іншых народаў і людзей;
- фарміраванне інтэлектуальных якасцей асобы, неабходных для пераўтваральнай і творчай пазнавальнай дзейнасці, аналізу сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці і прагназавання ўласнай жыццядзейнасці, развіццё гістарычнага мыслення;
- фарміраванне грамадзянскага патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці, выхаванне любві да Радзімы, гонару за культурна-гістарычную спадчыну беларускага народа;
- авалоданне вучнямі спосабамі пошуку, збору, апрацоўкі і выкарыстання сацыяльна-гістарычнай інфармацыі, атрымання новых ведаў.

Веды аб працэсах утварэння дзяржаў і цывілізацый, фактах грамадска-палітычнага жыцця, асаблівасцях сацыяльна-эканамічнага, этнаканфесійнага і культурна-гістарычнага развіцця складаюць змястоўны кампанент, неабходны для падрыхтоўкі вучняў да жыццядзейнасці ва ўмовах фарміравання прававой дзяржавы і грамадзянскага грамадства ў нашай краіне. Спасціжэнне гістарычнага вопыту развіцця чалавецтва і своеасаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа мае вялікае значэнне для разумення вучнямі сучасных грамадскіх працэсаў і арыентацыі ў дынамічнай палітычнай і інфармацыйнай прасторы.

З V класа пачынаецца сістэматычнае вывучэнне сусветнай гісторыі як навучальнага прадмета, якое характарызуецца цэласнасцю, адноснай паўнатой і лагічнай завершанасцю. Вывучэнне гісторыі ажыццяўляецца на падзейна-храналагічным узроўні. Гэта стварае аптымальныя ўмовы для фарміравання ў вучняў устойлівай сістэмы ведаў аб гістарычным шляху, пройдзеным чалавецтвам і беларускім народам у прыватнасці. У выніку вучні павінны засвоіць важныя факты і асноўныя гістарычныя паняцці, якія характарызуюць гістарычны працэс у цэлым і розныя бакі грамадскага развіцця з раскрыццём найбольш істотных прычынна-выніковых сувязей. На аснове

паслядоўнага асэнсавання гістарычнага працэсу ў вучняў фарміруецца цэласнае ўяўленне пра тэндэнцыі і заканамернасці развіцця грамадства, ствараюцца яскравыя гістарычныя вобразы найбольш значных падзей, з'яў, людзей мінулых эпох. Нараўне з засваеннем факталагічнага і тэарэтычнага вучэбнага матэрыялу вучні павінны авалодаць асноўнымі спецыяльнымі спосабамі навучальна-пазнавальнай дзейнасці, звязанымі з лакалізацыяй гістарычных падзей, з'яў, працэсаў у часе і прасторы, з аналізам гістарычных дакументаў.

Вызначальнымі напрамкамі адбору вучэбнага матэрыялу з'яўляюцца гуманізацыя зместу адукацыі, плюралізм думак і падыходаў, якія грунтуюцца на творчым асэнсаванні і засваенні розных канцэпцый сусветнага гістарычнага працэсу. Вучэбныя праграмы па сваім змесце арыентуюць на вывучэнне грамадства і яго жыццядзейнасці ў розныя гістарычныя эпохі і ў розных аспектах: грамадска-палітычных, вытворчых, культурных, дэмаграфічных, сямейна-бытавых, экалагічных і інш. Аптымальным пры вывучэнні гісторыі з'яўляецца спалучэнне фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў, выкарыстанне храналагічнага, краязнаўчага і праблемнага прынцыпаў.

Фармацыйны падыход разглядае развіццё чалавецтва як натуральна-геаграфічны працэс, у аснове якога ляжыць паслядоўная змена грамадска-эканамічных фармацый з уласцівым кожнай фармацыі спосабам вытворчасці матэрыяльных выгод. Не адмаўляючы ролю ідэй у развіцці чалавецтва, марксісцкая тэорыя тым не менш лічыла духоўную сферу грамадскага жыцця другаснай, вытворнай ад эканамічных і сацыяльных адносін. У адрозненне ад фармацыйнага цывілізацыйны падыход разглядае ў якасці асноўнага аб'екта вывучэння лакальныя цывілізацыі, якія праходзяць пэўныя этапы развіцця і адрозніваюцца па характары матэрыяльнай і духоўнай культуры. Цывілізацыйны падыход акцэнтуе ўвагу на тым, што адрознівае адну цывілізацыю ад іншай, а ўнутры самой цывілізацыі надае выключнае значэнне перш за ўсё таму, што аб'ядноўвае людзей, — культуры ва ўсёй разнастайнасці яе формаў і праяўленняў (рэлігія, мастацтва, мараль, права, традыцыі, лад жыцця і г. д.). Тэорыя сусветнага цывілізацыйнага

развіцця рухаючай сілай гісторыі лічыць пашырэнне гарызонту ведаў і ўдасканаленне на гэтай аснове прылад працы.

У вучэбных праграмах прадстаўлены змест гістарычнай адукацыі, структураваны па класах, раздзелах і тэмах, прыкладнае размеркаванне вучэбнага часу.

Змест гістарычнай адукацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пабудаваны ў адпаведнасці з лінейным прынцыпам. Устаноўлены наступны парадак вывучэння сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі і размеркавання вучэбнага часу:

| Клас | Вучэбныя курсы | Аб'ём вучэбнага часу на тыдзень |
|---|---|---|
| V | Гісторыя Старажытнага свету | 2 г |
| VI | Гісторыя Сярэдніх вякоў: V—XIII стст.<br>Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. | 2 г |
| VII | Гісторыя Сярэдніх вякоў: XIV—XV стст.<br>Гісторыя Беларусі: другая палова XIII — першая палова XVI ст. | 2 г |
| VIII | Сусветная гісторыя Новага часу: XVI—XVIII стст.<br>Гісторыя Беларусі: другая палова XVI—XVIII ст. | 2 г |
| IX | Сусветная гісторыя Новага часу: XIX — пачатак XX ст.<br>Гісторыя Беларусі: канец XVIII — пачатак XX ст. | 2 г |
| X | Сусветная гісторыя Навейшага часу: 1918—1945 гг.<br>Гісторыя Беларусі: 1917—1945 гг. | 2 г |
| XI | Сусветная гісторыя Навейшага часу: другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст.<br>Гісторыя Беларусі: другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст. | 2 г |

Час, які адводзіцца ў вучэбных праграмах на вывучэнне раздзелаў і тэм, з'яўляецца прыкладным. Настаўнік мае права змяніць колькасць гадзін на вывучэнне асобных тэм і раздзелаў і паслядоўнасць іх вывучэння ў межах вучэбнага года, не парушаючы агульныя прапорцыі гадзін паміж сусветнай гісторыяй і гісторыяй Беларусі і захоўваючы змест і логіку вывучэння дадзеных прадметаў.

На вывучэнне вучэбных прадметаў «Сусветная гісторыя» і «Гісторыя Беларусі» ў X—XI класах грамадазнаўчага напрамку (гімназіі і ліцэі) прадугледжана па 70 гадзін у кожным класе. Пры вывучэнні вучэбных прадметаў у гэтых класах рэкамендуецца надаць больш увагі самастойнай працы вучняў, адпрацоўцы спосабаў навучальна-пазнавальнай дзейнасці, прадугледжаных вучэбнай праграмай, вывучэнню дакументаў для глыбейшага засваення вучнямі спосабаў пераўтваральнай і творчай дзейнасці.

Вывучэнне гісторыі пачынаецца з гісторыі Старажытнага свету — велізарнай гістарычнай эпохі ад з'яўлення чалавека да канца антычнасці. У гісторыі Старажытнага свету асвятляюцца пытанні ўзнікнення чалавечага грамадства, фарміравання і развіцця першых цывілізацый, раскрываюцца характэрныя рысы і галоўныя адрозненні цывілізацый Старажытнага Усходу і антычнасці. Пры вывучэнні гісторыі Сярэдніх вякоў (канец V—XV ст.) асвятляецца гісторыя сярэдневяковых цывілізацый Еўропы, Азіі, Афрыкі, Амерыкі, раскрываюцца агульныя заканамернасці і спецыфіка іх развіцця. Пры вывучэнні гісторыі Старажытнага свету і Сярэдніх вякоў перавага аддаецца цывілізацыйнаму падыходу з улікам ачаговага характару цывілізацый гэтых двух гістарычных перыядаў.

Пры вывучэнні Новай гісторыі (XVI — пачатак XX ст.) адлюстраваны працэс зліцця гістарычных лёсаў цывілізацый розных кантынентаў у адзіны гістарычны паток. Вучэбнай праграмай прадугледжана знаёмства з наступным матэрыялам: сусветна-гістарычнае значэнне Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, паскоранае развіццё краін Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі, пачатак навуковай рэвалюцыі, ідэйныя і палітычныя плыні эпохі Адраджэння, Рэфармацыі і Асветы, развіццё ка-

піталізму і буржуазныя рэвалюцыі, фарміраванне індустрыяльнай цывілізацыі, асаблівасці гістарычнага развіцця краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Першая сусветная вайна разглядаецца як праява крызісу заходнееўрапейскай цывілізацыі.

Вывучэнне Навейшай гісторыі не толькі ахоплівае гісторыю асобных краін свету, але і фарміруе цэласнае ўяўленне пра гістарычны працэс ад канца Першай сусветнай вайны да пачатку XXI ст. У курсе Навейшай гісторыі знайшлі адлюстраванне абагульняючыя вывады аб асноўных тэндэнцыях і грамадска-гістарычным вопыце папярэдняга развіцця. Пры вывучэнні гісторыі Новага і Навейшага часу прыярытэтным з'яўляецца праблемны падыход, які рэалізуецца ў разглядзе такіх пытанняў, як сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё краін Усходняй і Заходняй Еўропы, Паўночнай Амерыкі на этапе крызісу індустрыяльнага грамадства і яго пераходу да постіндустрыяльнай цывілізацыі; прычыны і наступствы сусветных войнаў і буйных сацыяльных рэвалюцый XX ст.; рэгіянальныя варыянты працэсу мадэрнізацыі ў краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі пасля крушэння каланіяльнай сістэмы; інтэграцыйныя і дэзынтэграцыйныя працэсы ў сучасным свеце.

Навейшая гісторыя мае выключнае значэнне з пункта погляду грамадзянскага выхавання вучняў і атрымання імі сацыяльна значымых ведаў аб сучасных тэндэнцыях развіцця свету. Веданне Навейшай гісторыі спрыяе падрыхтоўцы вучняў да самастойнага жыцця.

З VI класа пачынаецца сістэматычнае вывучэнне гісторыі Беларусі як вучэбнага прадмета. Вывучэнне гісторыі Беларусі заклікана закласці аснову для фарміравання нацыянальнай самаідэнтыфікацыі і самасвядомасці, выхавання чалавека-грамадзяніна, стараннага гаспадара на сваёй зямлі, адказнага за вынікі сваёй дзейнасці і перад сучаснікамі, і перад нашчадкамі.

У змесце вучэбнай праграмы адлюстраваны наступныя прынцыпова важныя навуковыя палажэнні, у адпаведнасці з якімі вывучаецца гісторыя Беларусі:

- існаванне адзінай старажытнарускай народнасці ў межах адзінай Старажытнарускай дзяржавы — Кіеўскай Русі, у

склад якой уваходзіла Полацкае княства, якое мела спецыфічную форму раннефеадальнай дзяржаўнасці ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі;

- утварэнне пасля распаду Старажытнарускай дзяржавы двух цэнтраў дзяржаўнай кансалідацыі ўсходніх славян — Маскоўскай Русі і Вялікага Княства Літоўскага, у рамках якіх праходзіла фарміраванне трох усходнеславянскіх этнасаў — рускага, беларускага, украінскага;
- станаўленне на старажытнарускай аснове беларускай народнасці (этнасу) у адміністрацыйных межах Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага (XIV—XVI стст.), якое мела ўсходнеславянскі этнічны падмурак;
- развіццё беларускага этнасу ў межах Рэчы Паспалітай ва ўмовах вострага міжцывілізацыйнага супрацьстаяння, якое прывяло да пераходу ў польскую сацыякультурную супольнасць магнатаў і шляхты ВКЛ;
- прызнанне польска-каталіцкага ўплыву ў якасці фактару, які падштурхнуў народныя масы да рэлігійна-вызваленчай барацьбы, якая не спынялася да ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай дзяржавы;
- уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай дзяржавы, у межах якой праходзіла фарміраванне этнічных, культурных, сацыяльна-эканамічных і палітычных перадумоў станаўлення беларускай нацыі;
- пераход ад аграрна-рамеснага да індустрыяльнага грамадства як працэс мадэрнізацыі, які праходзіў у Беларусі ва ўмовах рэформаў і рэвалюцый, якія паўплывалі на яго асаблівасці;
- стварэнне БССР як формы нацыянальна-дзяржаўнага ўтварэння беларускага народа, якая стала гістарычнай перадумовай для далейшага развіцця беларускай дзяржаўнасці ў форме суверэннай Рэспублікі Беларусь;
- абвяшчэнне і станаўленне суверэннай Рэспублікі Беларусь, фарміраванне асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы як найважнейшых фактараў кансалідацыі сучаснай беларускай нацыі.

Гісторыя Беларусі вывучаецца ў кантэксце ўсходнеславянскай, агульнаеўрапейскай і сусветнай гісторыі з улікам ства-

рэння адзінай адукацыйнай прасторы Саюза Беларусі і Расіі, краін СНД. На аснове параўнальна-гістарычнага падыходу разглядаюцца сацыяльна-эканамічныя, дзяржаўна-палітычныя, рэлігійна-царкоўныя, этнічныя і культурныя працэсы ў Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды. Гэта дае магчымасць глыбей і выразней усвядоміць месца і ролю Беларусі ва ўсходнеславянскай і агульнаеўрапейскай гісторыі, вызначыць агульнае і спецыфічнае ў яе гістарычным развіцці. Вучэбная праграма па гісторыі Беларусі прадугледжвае таксама вывучэнне краязнаўчага матэрыялу, прызначанага для асвятлення мясцовых асаблівасцей гістарычнага развіцця (рубрыка «Наш край»).

Засваенне зместу гістарычнай адукацыі арыентавана перш за ўсё на асобаснае развіццё вучняў, выкарыстанне патэнцыялу гістарычнай навукі для інтэлектуальнага выхавання і сацыялізацыі асобы вучняў, фарміравання іх каштоўнасных арыентацый і светапоглядных перакананняў.

Значнае месца ў вучэбных праграмах па гісторыі адведзена пытанням сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства ў розныя гістарычныя эпохі. Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню працоўнай дзейнасці людзей, іх заняткаў і эканамічных інтарэсаў, удасканалення сродкаў вытворчасці, формаў уласнасці, прадукцыйнасці працы, рацыянальнага выкарыстання прыродных багаццяў, аховы навакольнага асяроддзя, характару размеркавання матэрыяльных і духоўных выгод.

Істотна перагледжаны падыход да асвятлення гісторыі культуры. Разам з вывучэннем гісторыі развіцця адукацыі, навукі, грамадскай думкі, літаратуры і мастацтва разглядаецца культура працы, побыту, сямейных адносін, адзення, жылля, паселішчаў і г. д., што з’яўляецца важнай умовай сацыялізацыі асобы вучня.

Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню ўкладу беларускай культуры ў скарбніцу сусветнай культуры. Характарызуюцца асноўныя дасягненні ў развіцці адукацыі, навукі і мастацкай культуры, іх узаемасувязь з сацыяльна-эканамічным і палітычным жыццём, творчасць вядомых дзеячаў культуры. Разам з пытаннямі культуры вывучаецца і рэлігія як адна з формаў грамадскай свядомасці і асноў цывілізацыі.

Важную ролю ў павышэнні эфектыўнасці навучання гісторыі адыгрывае выкарыстанне ўнутры- і міжпрадметных сувязей, якія з'яўляюцца аб'ектыўным выражэннем інтэграцыйных працэсаў, якія адбываюцца зараз як у сферы навукі і тэхнікі, так і ў жыцці грамадства. Гэта дазваляе пераадолець прадметную ізаляванасць і дубліраванне навучальнага матэрыялу, спрыяе актуалізацыі і паглыбленню ведаў, садзейнічае фарміраванню цэласных уяўленняў аб гістарычных з'явах і працэсах і ўзаемасувязі паміж імі. Ажыццяўленне міжпрадметных сувязей робіць веды практычна больш значнымі і прымянімымі, дапамагае вучням выкарыстоўваць веды і ўменні, набытыя пры вывучэнні такіх прадметаў, як «Грамадазнаўства», «Руская літаратура», «Беларуская літаратура», «Геаграфія», у працэсе вывучэння гісторыі і, наадварот, ужываць іх у новай сітуацыі, як у вучэбнай, так і ў пазавучэбнай дзейнасці. Унутры- і міжпрадметныя сувязі неабходна ажыццяўляць, улічваючы спецыфіку гістарычных курсаў, асобных тэм і раздзелаў.

Арыентацыя адукацыйнага працэсу на прадуктыўны характар навучальна-пазнавальнай дзейнасці вучняў і развіццё іх творчых здольнасцей абумовіла ўзмацненне дзейнаснага кампанента ў змесце навучання. Для арганізацыі засваення адпаведных спосабаў дзейнасці рэкамендуецца выкарыстанне практычных заняткаў, якія павінны актыўна ўкараняцца ў адукацыйную практыку. Падчас такіх заняткаў вучні на аснове раней атрыманых ведаў і апорных уменняў у новай навучальнай сітуацыі самастойна вырашаюць пазнавальныя задачы, выконваюць праблемныя заданні, праводзяць навучальнае даследаванне, публічна прадстаўляюць вынікі індывідуальнай і калектыўнай даследчай і творчай дзейнасці. Пры гэтым рэкамендуецца выкарыстоўваць розныя формы арганізацыі вучэбных заняткаў: ролевыя і дзелавыя гульні, семінары, канферэнцыі, дыспуты, распрацоўку праектаў з прыцягненнем шырокага спектра крыніц гістарычнай інфармацыі.

# V КЛАС

## ГІСТОРЫЯ СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ

**(70 гадзін, у тым ліку 3 гадзіны — рэзервовы час)**

### **Уводзіны** (2 гадзіны)

**Што такое гісторыя?** Як мы даведваемся аб тым, што адбывалася ў далёкім мінулым. Гістарычныя крыніцы. Рэчавыя крыніцы. Пісьмовыя крыніцы.

**Лічэнне гадоў у гісторыі.** Як лічылі гады ў старажытнасці. Паняцці «да нашай эры», «наша эра». «Стужка часу».

***Асноўныя паняцці:*** гісторыя, Старажытны свет, гістарычная крыніца, рэчавая крыніца, пісьмовая крыніца, наша эра, да нашай эры.

### РАЗДЗЕЛ I
### **ЖЫЦЦЁ ПЕРШАБЫТНЫХ ЛЮДЗЕЙ** (7 гадзін)

**На досвітку чалавечай гісторыі.** Паходжанне чалавека. Першыя прылады працы і заняткі найстаражытнейшых людзей. Першабытны чалавечы статак.

**Людзі старажытнага каменнага веку.** Вынаходніцтва новых прылад працы. Выкарыстанне агню. Авалоданне маўленнем. З'яўленне чалавека разумнага. Спажывецкая (прысвойваючая) гаспадарка: збіральніцтва, паляванне, рыбалоўства.

**Першыя крокі чалавека сучаснага віду.** Краманьёнцы — людзі сучаснага віду. Пераход да родавага ладу. Стаянкі старажытных людзей.

**Узнікненне рэлігіі і мастацтва.** Рэлігійныя вераванні. Нараджэнне мастацтва. Наскальны жывапіс. Скульптура.

**З'яўленне земляробства і жывёлагадоўлі.** Удасканаленне прылад працы. Пераход да вытворчай гаспадаркі. Побыт і за-

няткі першабытных землям робаў і жывёлаводаў. Вынаходніцтва рамёстваў. Росквіт родавага ладу.

**Пераход ад родавай абшчыны да суседскай.** Развіццё рамяства і гандлёвага абмену. Новыя ўяўленні людзей аб навакольным свеце. Распад родавага ладу. Суседская абшчына.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** прылады працы, каменны век, першабытны чалавечы статак, родавая абшчына, племя, спажывецкая (прысвойваючая) гаспадарка, вытворчая гаспадарка, савет старэйшын, рамяство, суседская абшчына, дзяржава, цывілізацыя, культура, рэлігія, бог, ідал, мнагабожжа, культ.

## РАЗДЗЕЛ II
## ЦЫВІЛІЗАЦЫІ СТАРАЖЫТНАГА УСХОДУ І АМЕРЫКІ (24 гадзіны)

### Тэма 1. Старажытны Егіпет (7 гадзін)

**Прырода і насельніцтва Старажытнага Егіпта.** Геаграфічнае становішча і прырода. Значэнне ракі Ніл у жыцці старажытных егіпцян. Егіпцяне-земляробы. Жыццё і праца рамеснікаў.

**Егіпецкая дзяржава.** Утварэнне Старажытнаегіпецкай дзяржавы. Улада і становішча фараонаў. Грамадскі лад Старажытнага Егіпта.

**Ператварэнне Егіпта ў магутную дзяржаву.** Ваенныя паходы фараонаў. Заваяванні Тутмаса III і Рамзэса II. Фараон Эхнатон. Паступовы заняпад улады і магутнасці фараонаў.

**Побыт і паўсядзённае жыццё старажытных егіпцян.** Жыццё простых егіпцян. У доме знатнага егіпцяніна. Адзенне, знешняе аблічча і харчаванне старажытных егіпцян. Егіпецкая сям'я.

**Рэлігія старажытных егіпцян.** Вераванні старажытных егіпцян. Абагаўленне жывёл і Ніла. Ушанаванне бога Азірыса.

**Культура старажытных егіпцян.** Пісьменнасць. Егіпецкая школа. Развіццё навуковых ведаў. Старажытнаегіпецкае мастацтва.

**Урок абагульнення**

### Тэма 2. Пярэдняя Азія ў старажытнасці (10 гадзін)

**Паміж Тыграм і Еўфратам.** Геаграфічнае становішча. Прыродныя ўмовы. Развіццё земляробства і жывёлагадоўлі.

**Першыя дзяржавы ў Месапатаміі.** Рамёствы і гандаль. Узнікненне гарадоў-дзяржаў. Шумер і Акад.

**Дзяржава Хамурапі.** Уваход качэўнікаў у Месапатамію. Заснаванне Вавілона. Стварэнне дзяржавы Хамурапі. Законы цара Хамурапі.

**Асірыя і Вавілонія.** Асірыйцы і іх дзяржава. Росквіт і гібель Асірыі. Дзяржава Навухаданосара.

**Культура і рэлігія народаў Міжрэчча.** Вынаходніцтва пісьменнасці. Клінапіс. Веды жыхароў Старажытнага Міжрэчча. Месапатамскі каляндар. Рэлігія народаў Месапатаміі.

**Хецкая дзяржава.** Паходжанне хетаў. Утварэнне Хецкага царства ў Малой Азіі. Хецкая армія і захопніцкія паходы хетаў. Рэлігія хетаў.

**Старажытны Іран.** Прыродныя ўмовы і насельніцтва. Першыя дзяржавы. Узвышэнне Персідскай дзяржавы. Рэлігія Старажытнага Ірана.

**Старажытная Фінікія.** Геаграфічнае становішча. Фінікійскія гарады-дзяржавы. Фінікійцы — гандляры і мараплаўцы. Культурная спадчына Старажытнай Фінікіі.

**Старажытная Палесціна.** Жыццё і рэлігія старажытных яўрэяў. Утварэнне Ізраільскага царства. «Залаты век» цара Саламона. Распад Ізраільскага царства.

**Урок абагульнення**

### Т э м а 3. **Старажытныя Індыя і Кітай** (4 гадзіны)

**Старажытная Індыя.** Геаграфічнае становішча і прырода. Узнікненне дзяржавы. Старажытныя арыі, іх грамадства і гаспадарчае жыццё. Вялікая дзяржава Маур’еў.

**Культура Старажытнай Індыі.** Мовы і пісьменства. Літаратура. Індыйскія Веды. Рэлігіі Старажытнай Індыі. Узнікненне будызму. Індуізм.

**Старажытны Кітай.** Краіна і насельніцтва. Заняткі старажытных кітайцаў. Стварэнне адзінай кітайскай дзяржавы. Імперыі Цынь і Хань.

**Грамадства і культура Старажытнага Кітая.** Пісьменства. Развіццё навуковых ведаў і мастацтва. Канфуцый і яго вучэнне. Рэлігія Старажытнага Кітая.

### Т э м а 4. **Старажытная Амерыка** (2 гадзіны)

**Найстаражытнейшае насельніцтва Амерыкі.** Засяленне Амерыкі. Асноўныя заняткі людзей: паляванне і збіральніцтва. Пераход да земляробства.

**Цывілізацыя альмекаў.** Развіццё сельскай гаспадаркі і рамёстваў. Рэлігійныя вераванні. Храмавыя ансамблі і гарадскія цэнтры. Культурная спадчына альмекаў.

***Асноўныя паняцці:*** арашальнае земляробства, абмен і гандаль, фараон, дынастыя, чыноўнік, рэформа, рабства, мумія, саркафаг, жрэц, піктаграфія, іерогліф, папірус, Месапатамія (Міжрэчча, Двурэчча), клінапіс, горад-дзяржава, сатрап, калонія, адзінабожжа, Стары Запавет, Біблія, варна, Веды, індуізм, будызм, імператар, Вялікая Кітайская сцяна, канфуцыянства.

### **Урок абагульнення** (1 гадзіна)

## Р А З Д З Е Л III
## **СТАРАЖЫТНАЯ ГРЭЦЫЯ** (17 гадзін)

**Прырода і насельніцтва Старажытнай Грэцыі.** Прырода і геаграфічнае становішча. Грэцыя мацерыковая і астраўная. Заняткі старажытных грэкаў.

**Мінойскі Крыт і яго культура.** Геаграфічнае становішча. Легендарны цар Мінас. Утварэнне Крыцкага царства. Кноскі палац. Дасягненні крыцкай культуры.

**Ахейская Грэцыя.** Ахейскае заваяванне Грэцыі. «Златабагатыя Мікены». Траянская вайна. Дасягненні мікенскай культуры. Паэмы Гамера «Іліяда» і «Адысея». Дарыйскае заваяванне.

**Рэлігія старажытных грэкаў.** Міфы старажытных грэкаў. Багі-алімпійцы. Культ, або ўшанаванне, багоў.

**Узнікненне грэчаскага поліса**. Пачатак эпохі жалеза ў Старажытнай Грэцыі. Развіццё рамёстваў і гандлю. Пераўтварэнне старажытнага поліса ў дзяржаву. Характэрныя рысы старажытнагрэчаскіх дзяржаў.

**Вялікая грэчаская каланізацыя.** Прычыны каланізацыі. Заснаванне калоній у Міжземнамор'і і Прычарнамор'і. Грэкі і варвары. Вынікі і гістарычнае значэнне грэчаскай каланізацыі.

**Старажытная Спарта**. Узнікненне Спартанскай дзяржавы. Органы ўлады. Свабодныя і ілоты. Спартанскі лад жыцця. Становішча жанчыны.

**Узнікненне і развіццё Афінскай дзяржавы.** Прырода і насельніцтва Атыкі. Горад-дзяржава Афіны. Грамадскі лад афінскага поліса. Дэмас і рабы. Панаванне арыстакратыі. Законы Салона.

**Грэка-персідскія войны.** Уваход персаў у Грэцыю. Марафонская бітва. Афінскі марскі саюз. Перамога грэкаў над персамі. Эпоха Перыкла і росквіт дэмакратыі.

**Пелапанеская вайна і заняпад Афін.** Узрастанне варожасці паміж Афінамі і Спартай. Ваенныя дзеянні паміж дзвюма дзяржавамі. Збядненне грамадзян. Наступствы Пелапанескай вайны.

**Дзяржава Аляксандра Македонскага**. Заваёвы Грэцыі Македоніяй. Усходні паход Аляксандра Македонскага. Разгром Персідскай дзяржавы. Дзяржава Аляксандра Македонскага і яе падзел.

**Адукацыя і навуковыя веды.** Як вучылі дзяцей у Старажытнай Грэцыі. Школы і гімнасіі. Навуковыя веды. Грэчаскія філосафы.

**Грэчаская архітэктура і скульптура**. Знакамітыя збудаванні Афін. Асаблівасці старажытнагрэчаскай архітэктуры. Услаўленыя скульптары: Фідзій, Міран, Паліклет, Праксіцель.

**Старажытнагрэчаскі тэатр і агульнагрэчаскія святы.** Паходжанне тэатра. Трагедыі і камедыі. Знакамітыя старажытнагрэчаскія драматургі: Эсхіл, Сафокл і Эўрыпід. Алімпійскія гульні.

**Паўсядзённае жыццё і побыт старажытных грэкаў**. Жыццё ў полісе. Жыллё. Харчаванне і адзенне.

**Эліністычная культура.** Характэрныя рысы эліністычнай культуры. Развіццё навукі і мастацтва. Александрыя Егіпецкая. Выдатны вучоны Архімед.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** антычнасць, фрэска, Элада, Траянская вайна, «Іліяда», «Адысея», поліс, грамадзянін, арыстакратыя, Народны сход, дэмас, афінская дэмакратыя, алігархія, каланізацыя, метраполія, грэка-персідскія войны, агора, Акропаль, Марафонская бітва, Пелапанеская вайна, Парфенон, элінізм.

## РАЗДЗЕЛ IV
## СТАРАЖЫТНЫ РЫМ (14 гадзін)

**Царскі Рым.** Прырода і насельніцтва Італіі. Органы ўлады царскага Рыма. Патрыцыі і плебеі. Звяржэнне царскай улады.

**Ранняя Рымская рэспубліка.** Усталяванне рэспублікі і яе арыстакратычны характар. Барацьба плебеяў і патрыцыяў. Законы XII табліц. Правы і абавязкі грамадзян.

**Заваяванне Рымам Італіі.** Войны Рыма з суседнімі плямёнамі. Нашэсце галаў на Рым. Вайна з царом Пірам. Устанаўленне кантролю над Італіяй.

**Заваяванне Рымам Міжземнамор'я.** Вайна Рыма з Карфагенам (Пунічныя войны). Паход Ганібала на Рым. Вынікі Пунічных войнаў.

**Зямельная і ваенная рэформы ў Рыме.** Уплыў заваявальных войнаў на рымскае грамадства. Збядненне земляробаў. Заканадаўства братоў Гракхаў. Ваенная рэформа Гая Марыя.

**Рабаўладальніцтва ў Рыме.** Крыніцы рабства ў Старажытным Рыме. Становішча рабоў. Паўстанне Спартака: прычыны, ход і гістарычнае значэнне.

**Падзенне Рымскай рэспублікі і стварэнне імперыі.** Грамадзянскія войны. Рымскія дыктатары. Праўленне Цэзара. Прыход да ўлады Актавіяна Аўгуста.

**Рымскія імператары.** Улада і паўнамоцтвы рымскіх імператараў. Праўленне Актавіяна Аўгуста. Імператары Нерон, Траян, Дыяклетыян.

**Рым — сталіца імперыі.** «Усе дарогі вядуць у Рым». Паўсядзённае жыццё грамадзян. Грамадскія відовішчы.

**Культура Старажытнага Рыма.** Рымляне — вучні грэкаў. Рымская літаратура і яе значэнне. Асноўныя помнікі архітэктуры і скульптуры.

**Рэлігія старажытных рымлян.** Багі ў прыватным жыцці рымлян. Багі рымскай дзяржавы. Пантэон Рыма.

**Узнікненне і распаўсюджанне хрысціянства ў Рымскай імперыі.** Вучэнне Ісуса Хрыста і нараджэнне новай рэлігіі. Новы Запавет. Першыя хрысціянскія абшчыны. Ганенні на хрысціян. Распаўсюджанне хрысціянства ў Рымскай імперыі.

**Падзенне Заходняй Рымскай імперыі.** Крызіс гаспадаркі і кіравання ў Рымскай імперыі ў III ст. н. э. Падзел Рымскай

імперыі на Заходнюю і Усходнюю. Націск германскіх плямёнаў. Узяцце Рыма готамі і вандаламі. Гібель Заходняй Рымскай імперыі.

**Урок абагульнення**

## РАЗДЗЕЛ V
## **СТАРАЖЫТНЫЯ ГЕРМАНЦЫ І СЛАВЯНЕ** (2 гадзіны)

**Старажытныя германцы.** Паходжанне і рассяленне германскіх плямёнаў. Грамадскі лад германцаў. Становішча жанчыны ў германскім грамадстве. Германцы і Рым.

**Старажытныя славяне.** Паходжанне і рассяленне славян. Жыццё і заняткі славян. Вераванні старажытных славян.

***Асноўныя паняцці:*** патрыцыі, плебеі, цар, сенат, Рымская рэспубліка, народны трыбун, вета, Пунічныя войны, паўстанне Спартака, грамадзянская вайна, Рымская імперыя, варвары, хрысціянства, Евангелле, Новы Запавет, царква, Заходняя Рымская імперыя, Усходняя Рымская імперыя.

## **Выніковае абагульненне** (1 гадзіна)

### СПОСАБЫ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ЗАСВОІЦЬ ВУЧНІ V КЛАСА:

называць даты гістарычных падзей;
вызначаць паслядоўнасць, працягласць гістарычных падзей;
вызначаць месцазнаходжанне вывучаемых гістарычных аб’ектаў на гістарычнай карце;
апісваць гістарычныя падзеі, помнікі культуры;
раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі;
раскрываць змест гістарычных паняццяў.

# VI КЛАС

## ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ: V—XIII стст.

### (35 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)

**Уводзіны** (1 гадзіна)

**Сярэдневякоўе ў гісторыі чалавецтва.** Паняцце «сярэднія вякі». Тры ўзросты Сярэдневякоўя. Асноўныя крыніцы па гісторыі Сярэдневякоўя. Сярэдневяковыя цывілізацыі. Спадчына Сярэдневякоўя.

***Асноўныя паняцці:*** Сярэднія вякі (Сярэдневякоўе), Ранняе сярэдневякоўе, Высокае сярэдневякоўе, Позняе сярэдневякоўе, хроніка, аналы, летапіс.

### Р А З Д З Е Л I
### ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА І ВІЗАНТЫЯ (15 гадзін)

Т э м а 1. **Ранняе сярэдневякоўе: V—IX стст.** (6 гадзін)

**Свет і Еўропа ў пачатку Сярэдневякоўя.** Вялікае перасяленне народаў. Варварскія каралеўствы. Візантыйская і Франкская імперыі. Час нашэсцяў.

**Утварэнне дзяржавы франкаў.** Заняткі і грамадскі лад франкаў. Хлодвіг — кароль франкаў. Адносіны ў грамадстве.

**Франкская імперыя.** Карл Вялікі. Нараджэнне новай імперыі. Падзел Франкскай імперыі.

**Візантыйская імперыя.** Утварэнне Візантыйскай імперыі. Улада імператара. Росквіт Візантыі ў перыяд праўлення Юсцініяна. У акружэнні ворагаў.

**Хрысціянства ў Еўропе.** Распаўсюджанне хрысціянства. Іерархія духавенства. Царква ў дзяржаве франкаў. Спаборніцтва Рыма і Канстанцінопаля.

**Вытокі сярэдневяковай культуры.** Антычная спадчына і царква. Развіццё адукацыі і навуковых ведаў. Культура Візантыі. «Каралінгскае Адраджэнне».

### Т э м а 2. **Высокае сярэдневякоўе: X—XIII стст**. (8 гадзін)

**Свет і Еўропа ў Высокім сярэдневякоўі.** Утварэнне новых дзяржаў у Заходняй Еўропе. Феадальная раздробленасць у Заходняй Еўропе. Палітычная раздробленасць. Мангольскае нашэсце.

**Феадальны лад у Заходняй Еўропе X—XIII стст.** Феадалы: сеньёры і васалы. Феадалы і сяляне. Натуральная гаспадарка. Жыццё сялян. Жыццё феадалаў.

**Сярэдневяковы горад.** Прычыны ўзнікнення гарадоў. Як узнікалі гарады. Гарады — цэнтры рамяства і гандлю. Гарадское рамяство. Барацьба гараджан за самакіраванне.

**Каталіцкая царква.** Царкоўны раскол 1054 г. Рымскія папы — уладыкі Заходняй Еўропы. Каталіцкая царква і ерэтыкі. Інквізіцыя.

**Крыжовыя паходы.** Прычыны крыжовых паходаў. Першы крыжовы паход. Духоўна-рыцарскія ордэны. Чацвёрты крыжовы паход і Візантыя. Наступствы крыжовых паходаў.

**Англія і краіны Скандынавіі ў X—XIII стст.** Паходы нарманаў. Дзяржавы Скандынавіі. Нармандскае заваяванне Англіі. Каралеўская ўлада. Войны англійскіх каралёў. Узнікненне парламента.

**Краіны Заходняй і Паўднёвай Еўропы.** Францыя ў X—XIII стст. Свяшчэнная Рымская імперыя ў Высокім сярэдневякоўі. Краіны Пірэнейскага паўвострава. Рэканкіста.

**Заходнееўрапейская культура Высокага сярэдневякоўя.** Прычыны культурнага ўздыму ў Заходняй Еўропе. Развіццё адукацыі. Узнікненне ўніверсітэтаў. Развіццё навуковых ведаў. Архітэктура. Літаратура.

***Асноўныя паняцці:*** вялікае перасяленне народаў, варварскія каралеўствы, Франкская імперыя, Візантыйская імперыя, сярэдневяковыя цывілізацыі, знаць, дружына, «Салічная праўда», бенефіцый, пазямельная залежнасць, асабістая залеж-

насць, «Кодэкс Юсцініяна», хрысціянская царква, духавенства, іерархія, дзесяціна, мазаіка, ікона, «Каралінгскае Адраджэнне», Свяшчэнная Рымская імперыя, саслоўе, феод, феадалізм, феадальная раздробленасць, міжусобныя войны, сеньёр, васал, рыцар, феадальная лесвіца, феадальны маёнтак, павіннасці, феадальная залежнасць, натуральная гаспадарка, горад, таварнаграшовая гаспадарка, майстэрня, цэх, гільдыя, самакіраванне, каталіцкая царква, праваслаўная царква, ерась, інквізіцыя, крыжовы паход, Вялікая хартыя вольнасцей, парламент, Рэканкіста, універсітэт, раманскі стыль, гатычны стыль.

**Урок абагульнення** (1 гадзіна)

## РАЗДЗЕЛ II
## СЛАВЯНЕ Ў РАННІМ І ВЫСОКІМ СЯРЭДНЕВЯКОЎІ (9 гадзін)

**Славяне ў Раннім сярэдневякоўі.** Падзел славян на ўсходніх, заходніх і паўднёвых. Грамадскі лад і заняткі славян. Утварэнне першых дзяржаў. Дзейнасць Кірылы і Мяфодзія.

**Заходнія славяне ў X—XIII стст.** Утварэнне Чэшскай дзяржавы. Чэшскія правіцелі — Баляславы. Чэхія і Германія. Утварэнне Польскай дзяржавы. Польшча і суседзі. Гаспадарка і грамадства заходніх славян.

**Краіны Балканскага паўвострава ў X—XIII стст.** Гаспадарка і асаблівасці развіцця балканскіх зямель. Славяне і Візантыя. Балгарскія царствы. Сербскія дзяржавы. Харвацкая дзяржава.

**Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы.** Усходнія славяне і іх суседзі. Ля вытокаў Старажытнарускай дзяржавы. Праўленне Алега. Першыя Рурыкавічы.

**Росквіт Старажытнай Русі.** Русь у часы Уладзіміра Чырвонае Сонейка. Прыняцце хрысціянства. Русь пры Яраславе Мудрым. «Руская праўда». Старажытнае рускае грамадства. Уладзімір Манамах.

**Палітычная раздробленасць Старажытнай Русі.** Прычыны раздробленасці Старажытнарускай дзяржавы. Аслабленне ўлады кіеўскіх князёў. Найбуйнейшыя дзяржавы-княствы. Міжусобныя войны.

**Барацьба Русі са знешнімі ворагамі.** Качэўнікі прычарнаморскіх стэпаў. Барацьба з печанегамі і полаўцамі. Мангольскае нашэсце. Залатая Арда. Барацьба з крыжакамі. Аляксандр Неўскі.

**Культура Старажытнай Русі.** Царква ў культурным жыцці Старажытнай Русі. Пісьменства і літаратура. «Слова пра паход Ігаравы». Архітэктура і жывапіс. Майстэрства старажытнарускіх рамеснікаў. Паўсядзённае жыццё.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** саюз плямёнаў, веча, князь, дружына, племянное княжанне, кірыліца, «Аповесць мінулых часоў», варагі, Хазарскі каганат, Старажытнаруская дзяржава, палюддзе, пагост, пасаднік, тысяцкі, «Руская праўда», верв, вотчына, баяры, смерды, халопы, палітычная раздробленасць, вялікі князь, баярская рэспубліка, дваране, качавое земляробства, быліна, Залатая Арда, мангола-татарская навала, берасцяная грамата, «Слова пра паход Ігаравы».

## РАЗДЗЕЛ III
## ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ Ў V—XIII стст.
(8 гадзін)

**Узнікненне ісламу і Арабскі халіфат.** Прыродныя ўмовы і насельніцтва Аравійскага паўвострава. Арабы напярэдадні аб’яднання ў адзіную дзяржаву. Узнікненне ісламу і аб’яднанне арабаў. Заваяванні арабаў. Росквіт Арабскага халіфата і яго распад.

**Араба-ісламская культура.** Каран — свяшчэнная кніга мусульман. Іслам у жыцці сярэдневяковых мусульман. Росквіт культуры халіфата. Навука, літаратура, мастацтва.

**Іран і Сярэдняя Азія.** Іран і Сярэдняя Азія пасля распаду Арабскага халіфата. Культура Ірана і Сярэдняй Азіі. Мангольскае нашэсце.

**Індыйская цывілізацыя.** Гаспадарчае жыццё Індыі. Рэлігіі і каставы лад. Дэлійскі султанат. Навука і культура.

**Кітайская цывілізацыя.** Насельніцтва і заняткі. Дзяржаўны лад. Рэлігіі і культура. Кітай і качэўнікі.

**Японская цывілізацыя.** Утварэнне Японскай дзяржавы. Самураі. Барацьба з мангольскім нашэсцем. Рэлігіі і культура.

**Цывілізацыі Трапічнай Афрыкі і Амерыкі.** Асноўныя цывілізацыі Трапічнай Афрыкі. Амерыканскія цывілізацыі.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** арабы-бедуіны, іслам, Мухамед, халіф, Арабскі халіфат, Каран, мячэць, арабеска, мінарэт, Сельджукіды, шах, хан, індуізм, каста, Дэлійскі султанат, даасізм, кнігадрукаванне, «Краіна ўзыходзячага сонца», самурай, сёгун, сінтаізм, майя, тальтэкі, сапатэкі.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА СЯРЭДЗІНЫ XIII ст.

**(35 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)**

## **Уводзіны** (1 гадзіна)

Значэнне ведаў па айчыннай гісторыі. Гісторыя Беларусі — частка сусветнай гісторыі. Перыядызацыя гісторыі Беларусі старажытных часоў і Сярэдневякоўя. Гістарычныя крыніцы.

***Асноўныя паняцці:*** айчынная гісторыя, «Аповесць мінулых часоў».

## РАЗДЗЕЛ І
## **БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СТАРАЖЫТНЫЯ ЧАСЫ** (9 гадзін)

**Найстаражытнейшыя людзі каменнага веку.** Тэрыторыя, прырода, кліматычныя ўмовы Беларусі. Абледзяненне і спробы пранікнення людзей на тэрыторыю Беларусі. Першыя стаянкі. Прылады працы. Паляванне на мамантаў.

**Жыццё людзей у пасляледавіковы перыяд.** Засяленне тэрыторыі Беларусі першабытнымі людзьмі. Заняткі і промыслы. Прысвойваючая гаспадарка.

**Супольнасці людзей каменнага веку.** Узнікненне родавай абшчыны. Мацярынскі род. Аб’яднанне родаў у плямёны.

**Першабытныя жывёлаводы і земляробы ў бронзавым і жалезным вяках.** Пранікненне індаеўрапейцаў на тэрыторыю Беларусі. Распаўсюджанне жывёлагадоўлі. Першыя земляробы. Пераход да вытворчай гаспадаркі.

**Пачатак выкарыстання металаў на беларускіх землях.** Выкарыстанне металічных прылад працы. Здабыча жалеза. Значэнне адкрыцця жалеза.

**Узнікненне няроўнасці ў грамадстве.** Узрастанне ролі мужчынскай працы ў бронзавым веку. Бацькоўскі род. З'яўленне маёмаснай няроўнасці ў грамадстве. Будаўніцтва гарадзішчаў у жалезным веку.

**Культура нашых продкаў.** Вераванні першабытных людзей. Міфалогія. Пахавальныя абрады. Першабытнае мастацтва.

**Наш край**

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** стаянка, паселішча, збіральніцтва, паляванне, бортніцтва, першабытны чалавечы статак, родавая абшчына, племя, індаеўрапейцы, жывёлагадоўля, мацярынскі род, бацькоўскі род, суседская абшчына, гарадзішча.

## РАЗДЗЕЛ II
## ЖЫЦЦЁ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У РАННІМ СЯРЭДНЕВЯКОЎІ (V—IX стст.) (8 гадзін)

**Балты на тэрыторыі Беларусі.** Тэрыторыя рассялення. Плямёны балтаў. Паселішчы балтаў на тэрыторыі Беларусі. Гаспадарка, гандаль. Мастацтва і рамёствы.

**Паходжанне і рассяленне славян.** Прарадзіма славян. Першыя звесткі аб славянах. Шляхі рассялення славян. З'яўленне славян на тэрыторыі Беларусі.

**Усходнеславянскія плямёны на тэрыторыі Беларусі.** Славяна-балцкае ўзаемадзеянне. Крывічы-палачане. Дрыгавічы. Радзімічы.

**На шляху да дзяржавы.** Князі, дружына. Ваеннае апалчэнне. Народны сход — веча. З'яўленне гарадоў. Племянныя княжанні.

**Гаспадарка, рамяство і гандаль усходніх славян.** Развіццё земляробства і жывёлагадоўлі. Развіццё грамадства. Рамяство і промыслы. Гандаль.

**Рэлігія і міфалогія ўсходніх славян.** Культ продкаў. Духі. Язычнікія багі. Свяцілішчы. Міфы і паданні. Абрады.

**Матэрыяльная культура ўсходніх славян.** Арнамент. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Жыллё. Адзенне. Зброя.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** балты, усходнія славяне, славяна-балцкае ўзаемадзеянне (славянізацыя балтаў), саюз плямёнаў, крывічы-палачане, дрыгавічы, радзімічы, князь, дружына, падсечна-агнявое земляробства, ворыўнае земляробства, язычніцтва.

## РАЗДЗЕЛ III
## СЯРЭДНЕВЯКОВЫЯ КНЯСТВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў IX — СЯРЭДЗІНЕ XIII ст. (14 гадзін)

**Дзяржаўнасць усходніх славян.** Паходжанне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. Месца беларускіх зямель у складзе Старажытнарускай дзяржавы. Старажытная (Кіеўская) Русь — супольная дзяржава ўсходніх славян. Старажытнаруская (усходнеславянская) народнасць.

**Полацкае княства ў IX—XI стст.** Старажытны Полацк. Саперніцтва з Ноўгарадам і Кіевам. Князь Усяслаў Брачыславіч. Бітва на рацэ Нямізе. Найвышэйшы ўздым Полацкага княства.

**Полацкая зямля ў XII — сярэдзіне XIII ст.** Раздробленасць Полацкай зямлі, яе прычыны і вынікі. Часовае ўзвышэнне Мінскага княства. Адносіны паміж Полацкім і Кіеўскім княствамі. Арганізацыя войска. Дзейнасць веча.

**Тураўскае княства.** Старажытны Тураў. Узнікненне Тураўскага княства. Адносіны Турава з Кіевам. Тураўскі князь Юрый Яраславіч. Старажытны Пінск.

**Пасожжа, Берасцейская зямля і Панямонне.** Беларускія гарады ў складзе Смаленскай і Чарнігаўскай зямель. Лёс Берасцейшчыны. Узнікненне гарадоў і княстваў у Панямонні. Балцкія суседзі Русі на паўночным захадзе.

**Знешняя небяспека ў першай палове XIII ст.** З'яўленне крыжакоў ва Усходняй Прыбалтыцы. Супрацьстаянне крыжакам. Зближэнне Полацка і Ноўгарада. Мангола-татарскае нашэсце.

**Гаспадарчыя адносіны.** Сельская (суседская) абшчына. Гаспадарчыя заняткі. Даніна і палюддзе ў IX—XI стст. Грашовае абарачэнне. Узнікненне феадальных адносін.

**Горад у IX — сярэдзіне XIII ст.** Шляхі ўзнікнення гарадоў. Першыя летапісныя ўпамінанні беларускіх гарадоў. Паходжанне назваў. Аблічча гарадоў. Рамяство і гандаль. Роля гарадоў у грамадскім жыцці.

**Хрысціянства на заходніх землях Старажытнай Русі.** Прычыны прыняцця хрысціянства. Першыя хрысціяне беларускіх зямель. Язычніцтва і хрысціянства. Вынікі і значэнне распаўсюджвання хрысціянства.

**Рэлігійна-асветніцкія дзеячы.** Хрысціянская царква і культура. Еўфрасіння Полацкая. Кірыла Тураўскі. Значэнне дзейнасці рэлігійных асветнікаў.

**Культура беларускіх зямель.** Будаўніцтва цэркваў. Мастацтва. Пісьменнасць. Помнікі пісьменства.

**Паўсядзённае жыццё нашых продкаў у IX—XIII стст.** Усходнеславянскае (старажытнарускае) грамадства. Паселішчы і жыллё. Харчаванне. Сродкі зносін. Ваенная справа і зброя. Забавы.

**Наш край**

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** Старажытная (Кіеўская) Русь, удзельнае княства, Полацкае княства, апалчэнне, крыжакі, Тураўскае княства, мангола-татары, мужы, баяры, даніна, волакі, чэлядзь, закуп, дзядзінец, пасад, торг, царкоўная дзесяціна, фрэска, Тураўскае евангелле.

### **Выніковае абагульненне** (1 гадзіна)

### СПОСАБЫ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ЗАСВОІЦЬ ВУЧНІ VI КЛАСА:

называць даты гістарычных падзей;

вызначаць паслядоўнасць, працягласць гістарычных падзей;

вызначаць месцазнаходжанне вывучаемых гістарычных аб'ектаў на гістарычнай карце;

апісваць гістарычныя падзеі, помнікі культуры;

параўноўваць гістарычныя падзеі па ўказаных крытэрыях;

раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі;

абагульняць гістарычныя факты, фарміраваць на іх аснове вывады;

раскрываць змест гістарычных паняццяў.

# VII КЛАС

## ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ: XIV—XV стст.

**(35 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)**

### **Уводзіны** (1 гадзіна)

**Свет і Еўропа ў Познім сярэдневякоўі.** Цывілізацыі Позняга сярэдневякоўя. Заходняя Еўропа ў XIV—XV стст. Лёс дзяржаў. Дзяржаўныя уніі. Падзенне Візантыі.

***Асноўныя паняцці:*** Позняе сярэдневякоўе, дзяржаўная унія, грашовы падатак, феадальныя адносіны.

### РАЗДЗЕЛ І
### **ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА** (14 гадзін)

**Змены ў грамадстве ў Заходняй Еўропе.** Развіццё сельскай гаспадаркі, вызваленне сялян. Змены ў феадальным саслоўі. Мануфактурная вытворчасць. Наёмныя рабочыя.

**Цэнтралізаваныя дзяржавы.** Дзяржавы ў Заходняй Еўропе. Фарміраванне цэнтралізаваных дзяржаў. Саслоўна-прадстаўнічая манархія. Дзяржаўны лад Англіі, Францыі і Іспаніі.

**Каталіцкая царква ў Познім сярэдневякоўі.** Падзенне магутнасці рымскіх пап. Авіньёнскі «палон» пап. «Вялікі раскол» у каталіцкай царкве. Дзяржавы Заходняй Еўропы і каталіцкая царква.

**Стогадовая вайна (1337—1453).** Прычыны Стогадовай вайны. Асноўныя ваенныя дзеянні. Жанна д'Арк. Вынікі Стогадовай вайны. Сялянскія паўстанні.

**Англія і Францыя ў другой палове XV ст.** Развіццё гаспадаркі ў Англіі і Францыі пасля Стогадовай вайны. Вайна Пунсовай і Белай ружы. Завяршэнне аб'яднання Францыі пад каралеўскай уладай.

**Германія.** Тэрыторыя Германіі. Дзяржаўны лад. «Залатая була». Нямецкая вёска. Ганзейскі саюз.

**Італія.** Паўночная Італія. Гаспадарчае развіццё Паўночнай Італіі. Венецыя і Генуя. Папская дзяржава. Паўднёвая Італія.

**Іспанія і Партугалія.** Кастылія, Арагон і Партугалія. Утварэнне Іспаніі. Завяршэнне Рэканкісты. Дзяржаўны лад Іспаніі і Партугаліі. Ідальга.

**Вытокі Адраджэння і гуманізму.** Узнікненне культуры Адраджэння. Гуманізм. Дантэ. Мастакі Джота і Мазачыо.

**Мысліцелі, паэты і пісьменнікі Адраджэння.** Петрарка. Бакачыо. Італьянскія гуманісты пра чалавека і грамадства.

**Мастацтва Ранняга Адраджэння.** Кнігадрукаванне. Жывапіс і скульптура Адраджэння. С. Батычэлі, Данатэла. Архітэктура Ф. Брунелескі. Вынаходніцтва кнігадрукавання. І. Гутэнберг.

**Пачатак Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.** Прычыны Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Партугалія і Іспанія — піянеры вялікіх адкрыццяў. «Прынц-мараплавец». Адкрыццё Х. Калумбам Амерыкі. Шлях у Індыю.

**Паўсядзённае жыццё чалавека Позняга сярэдневякоўя.** Пагаршэнне ўмоў жыцця еўрапейцаў у XIV ст. «Чорная смерць» і яе наступствы. Жыллё, адзенне, харчаванне. Забавы.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** познефеадальнае грамадства, мануфактура, падзел працы, наёмныя рабочыя, банк, цэнтралізаваная дзяржава, саслоўна-прадстаўнічая манархія, Генеральныя штаты, картэсы, авіньёнскі «палон», «вялікі раскол» у каталіцкай царкве, царкоўны сабор, Стогадовая вайна, сялянскае паўстанне, Жакерыя, вайна Пунсовай і Белай ружы, «Залатая була», рэйхстаг, Ганзейскі саюз, ідальга, Адраджэнне, інтэлігенцыя, гуманісты, гуманізм, Вялікія геаграфічныя адкрыцці.

## РАЗДЗЕЛ II
## **СЛАВЯНЕ Ў ПОЗНІМ СЯРЭДНЕВЯКОЎІ** (10 гадзін)

**Чэхія.** Чэшскае грамадства. Развіццё эканомікі. Праўленне Карла IV. Ян Гус і гусіты. Культура Чэхіі XIV—XV стст.

**Польшча.** Структура польскага грамадства. Развіццё эканомікі. Казімір III Вялікі. Польшча і Тэўтонскі ордэн. Культура Польшчы XIV—XV стст.

**Краіны Балканскага паўвострава ў XIV—XV стст.** Дзяржавы паўднёвых славян напярэдадні турэцкага заваявання. Асманскія заваяванні на Балканах. Бітва на Косавым полі. Падзенне Канстанцінопаля. Балканы пад уладай Асманскай імперыі.

**Узмацненне Маскоўскага княства.** Прычыны ўзвышэння Маскоўскага княства. Першыя маскоўскія князі. Дзмітрый Данскі. Бітва на Куліковым полі і яе значэнне. Знешняя палітыка Маскоўскага княства.

**Стварэнне адзінай Расійскай дзяржавы.** Феадальная вайна другой чвэрці XV ст. Рост тэрыторыі Вялікага Княства Маскоўскага. Іван III. Падзенне мангола-татарскай навалы. Адзіная Расійская дзяржава.

**Грамадства і гаспадарка Маскоўскай Русі.** Феадальнае грамадства. Сельская гаспадарка. Гарады і рамяство. Гандаль. Павіннасці і абавязкі насельніцтва. Ваенная справа. Судзебнік 1497 г.

**Праваслаўная царква ў Маскоўскай Русі.** Роля царквы ў жыцці краіны. Мітрапаліт Алексій, Сергій Раданежскі. Рэлігійныя спрэчкі, ерасі. Рускія манастыры.

**Культура Паўночна-Усходняй Русі XIV—XV стст.** Літаратура. Архітэктура. Маскоўскі Крэмль. Жывапіс: Феафан Грэк і Андрэй Рублёў.

**Жыццё людзей Маскоўскай Русі.** Жыллё. Харчаванне. Адзенне. Сям’я.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** бюргерства, паны, гусіты, гусіцкія войны, табарыты, шляхта, магнаты, Магдэбургскае права, удзел, Залатая Арда, ярлык, адзіная Расійская дзяржава, «стаянне на рацэ Угры», Вялікае Княства Маскоўскае, служылыя князі, баяры, вотчына, памесце, Баярская дума, дваране, сяляне, Крэмль, полк.

## РАЗДЗЕЛ III
## ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ (7 гадзін)

**Іран і Сярэдняя Азія.** Канец мангольскага валадарства ў Іране. Заваяванні Цімура і яго дзяржава. Распад дзяржавы Цімура.

**Асманская дзяржава.** Асманскае княства. Турэцкае войска. Аб’яднанне турэцкіх дзяржаў Асманамі.

**Індыя ў XIV—XV стст.** Узвышэнне султанаў Дэлі. Гарады і рамяство. Сельская гаспадарка. Заняпад Дэлійскага султаната. Дзяржавы поўдня Індыі. Гандаль. Прыбыццё еўрапейцаў у Індыю.

**Кітай у XIV—XV стст.** Зввяржэнне мангольскай навалы. Дынастыя Мін. Аднаўленне гаспадаркі краіны. Узвышэнне Кітая пры імператарах дынастыі Мін.

**Японская цывілізацыя.** Асаблівасці дзяржаўнага ладу Японіі. Міжусобныя войны. Японскі жывапіс і тэатр.

**Цывілізацыі Трапічнай Афрыкі і Амерыкі.** Цывілізацыі Трапічнай Афрыкі. Амерыканскія цывілізацыі.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** дзяржава Цімура, Асманскае княства, Асманская дзяржава, янычары, цімар, паўстанне «чырвоных войскаў», дынастыя Мін, Забаронены горад, Вялікі шаўковы шлях, сёгунат Асікага, тэатр Но, ацтэкі, інкі.

**Выніковае абагульненне** (1 гадзіна)

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: ДРУГАЯ ПАЛОВА XIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XVI ст.

**(35 гадзін, у тым ліку 3 гадзіны — рэзервовы час)**

### Уводзіны (1 гадзіна)

Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ) у гісторыі беларускага народа. Гістарычныя крыніцы. Асаблівасці перыядызацыі гісторыі Беларусі ў Сярэднія вякі.

***Асноўныя паняцці:*** Вялікае Княства Літоўскае.

## РАЗДЗЕЛ I
## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIII—XIV ст. (11 гадзін)

**Вытокі ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага.** Прычыны і асаблівасці ўтварэння новай дзяржавы. Літоўскія плямёны ў Верхнім Панямонні. Славянская каланізацыя Верхняга Панямоння. Узнікненне ўсходнеславянскіх гарадоў у Верхнім Панямонні. Удзельныя княствы.

**Пачатак Вялікага Княства Літоўскага.** Першыя звесткі пра Літву. Узвышэнне Навагрудскага княства. Каранацыя Міндоўга ў Навагрудку. Барацьба з крыжакамі. Барацьба за ўмацаванне дзяржавы.

**Умацаванне велікакняжацкай улады.** Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага. Княжанне Гедыміна.

**Княжанне Альгерда. Пачатак праўлення Ягайлы.** Альгерд і Кейстут. Барацьба Ягайлы за вялікае княжанне.

**Барацьба з крыжацкай агрэсіяй.** З'яўленне ў Прыбалтыцы Тэўтонскага ордэна. Асноўныя напрамкі крыжацкай агрэсіі. Стараста Давыд Гарадзенскі. Князь Андрэй Полацкі.

**Дзяржаўны лад ВКЛ у сярэдзіне XIII—XIV ст.** Тэрытарыяльны падзел ВКЛ. Дзяржаўны лад і кіраванне. Мясцовыя органы ўлады.

**Гаспадарчае жыццё.** Сельскагаспадарчыя заняткі і промыслы. Прылады працы. Сельскія паселішчы. Гарады. Спецыяльнасці рамеснікаў і іх вырабы. Феадальныя адносіны.

**Этнічнае і канфесійнае становішча.** ВКЛ як шматэтнічная дзяржава. Роля праваслаўнай царквы ў ВКЛ. Пачатак распаўсюджвання каталіцтва.

**Матэрыяльная і духоўная культура.** Архітэктура. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Побыт насельніцтва.

**Наш край**

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** Літва, каланізацыя, славянізацыя, дзядзінец, унія, Крэўская унія, прывілей, персанальная унія, княства, вялікі князь (гаспадар), намеснік, зямельны надзел, дым, шматэтнічная дзяржава, старажытнаруская (усходнеславянская) супольнасць, мітрапаліт, епархія, кляштар, кастэль.

РАЗДЗЕЛ II

## БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў КАНЦЫ XIV — СЯРЭДЗІНЕ XVI ст.
(19 гадзін)

**Княжанне Вітаўта.** Намаганні Вітаўта па аднаўленні самастойнасці ВКЛ. Вялікае Княства Літоўскае на вяршыні магутнасці. Спробы Вітаўта атрымаць каралеўскую карону.

**«Вялікая вайна» і Грунвальдская бітва.** Узмацненне крыжацкай небяспекі. Падрыхтоўка да рашучага адпору крыжакам. Грунвальдская бітва. Вынікі і гістарычнае значэнне бітвы. Торунскі мір.

**Грамадзянская вайна 1432—1439 гг.** Супярэчнасці паміж групоўкамі феадалаў у ВКЛ. Змаганне паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам. Бітва пад Вількамірам. Вынікі вайны. Усталяванне міру.

**Змены ў дзяржаўным ладзе ВКЛ у XV — сярэдзіне XVI ст.** Казімір Ягайлавіч і яго палітыка. Рада і сойм. Вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў ВКЛ. Абмежаванне ўлады вялікага князя. Заканадаўства ВКЛ.

**Унутрыпалітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст.** Выступленне М. Глінскага: прычыны, мэты і вынікі. Кансалідацыя вярхоў грамадства ВКЛ. Жыгімонт I Стары.

**Войска і вайсковая справа ў ВКЛ.** Арганізацыя войска. Вайсковая служба. Узбраенне.

**Знешнепалітычнае становішча ВКЛ у сярэдзіне XV — першай палове XVI ст.** Страта ВКЛ першынства ў збіранні «рускіх» зямель. Адносіны з Вялікім Княствам Маскоўскім. Абарона ад набегаў крымскіх татар.

**Развіццё феадальнага грамадства.** Саслоўі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Стан сельскай гаспадаркі. Землеўладанне і землекарыстанне. Павіннасці сялян. Этапы запрыгоньвання сялян.

**Развіццё гарадоў.** Насельніцтва гарадоў. Гарады і замкі на дзядзінцах. Магдэбургскае права. Гістарычная роля гарадоў.

**Гаспадарчыя заняткі гараджан.** Узрастанне значэння рамесніцкіх заняткаў. Гандаль.

**Утварэнне беларускай народнасці.** Асаблівасці фарміравання беларускага этнасу. Станаўленне старабеларускай мовы.

Адметныя рысы беларусаў і іх саманазвы. Паходжанне назвы «Белая Русь».

**Этнічныя меншасці ў ВКЛ.** Шматэтнічны характар дзяржавы. Татары. Яўрэі. Прыход цыганоў.

**Царква і рэлігія.** Палітыка дзяржавы ў адносінах да цэркваў. Становішча праваслаўнай царквы. Умацаванне пазіцый каталіцтва. Рэлігійная талерантнасць у ВКЛ.

**Культура ВКЛ у канцы XIV—XV ст.** Асноўныя мастацкія стылі. Культавае і абарончае дойлідства. Жывапіс і скульптура. Літаратура.

**Рэнесансная культура ў ВКЛ у першай палове XVI ст.** Рэнесанс і яго праявы ў культуры і паўсядзённым жыцці. Літаратура. Мікола Гусоўскі. Развіццё кнігадрукавання.

**Францыск Скарына — усходнеславянскі і беларускі гуманіст і асветнік.** Жыццёвы шлях Ф. Скарыны. Погляды і выдавецкая дзейнасць Скарыны. Значэнне дзейнасці і поглядаў Ф. Скарыны.

**Наш край**

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** «Вялікая вайна», Грунвальдская бітва, Судзебнік Казіміра, рада, сойм, павятовы соймік, ваявода, кашталян, канцлер, вялікі гетман, земскі падскарбі, Статут Вялікага Княства Літоўскага, пагоня, паспалітае рушэнне, харугва, саслоўе, феадал, чынш, фальварак, фальваркова-паншчынная сістэма, прыгон, мястэчка, магістрат, войт, цэх, этнас, народнасць, беларуская народнасць, рэлігійная талерантнасць.

## **Выніковае абагульненне** (1 гадзіна)

### СПОСАБЫ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ЗАСВОІЦЬ ВУЧНІ VII КЛАСА:

называць храналагічныя рамкі гістарычных падзей, з'яў;

вызначаць паслядоўнасць, працягласць гістарычных падзей;

вызначаць месцазнаходжанне вывучаемых гістарычных аб'ектаў на гістарычнай карце;

вызначаць у гістарычных тэкстах структуру гістарычнага часу (эпоха, перыяд, стагоддзе, год);

апісваць гістарычныя падзеі, помнікі культуры;

параўноўваць гістарычныя падзеі па ўказаных крытэрыях;

раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі;

абагульняць гістарычныя факты, фармуляваць на іх аснове вывады;

класіфікаваць і сістэматызаваць гістарычныя факты;

пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

раскрываць змест гістарычных паняццяў;

канкрэтызаваць гістарычныя паняцці.

# VIII КЛАС

## СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НОВАГА ЧАСУ: XVI—XVIII стст.

**(35 гадзін, у тым ліку 1 гадзіна — рэзервовы час)**

### **Уводзіны** (1 гадзіна)

Асноўны змест і перыядызацыя гісторыі Новага часу. Характэрныя рысы еўрапейскай цывілізацыі. Асаблівасці развіцця ўсходніх цывілізацый у Новы час.

***Асноўныя паняцці:*** Новая гісторыя (гісторыя Новага часу), цывілізацыя, навуковая карціна свету, заходнееўрапейская цывілізацыя, усходнія цывілізацыі.

### РАЗДЗЕЛ І
### **ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА** (16 гадзін)

#### Тэма 1. **Ад Сярэдневякоўя да Новага часу** (7 гадзін)

**Эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.** Першае кругасветнае падарожжа Ф. Магелана. Еўрапейскія мараплаўцы і іх адкрыцці. Наступствы і значэнне Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.

**Умацаванне новай культуры ў эпоху Адраджэння.** Гуманістычныя каштоўнасці эпохі Адраджэння. Адносіны гуманістаў да царквы і іх цікавасць да антычнасці. Мары гуманістаў аб усеагульным шчасці чалавецтва і першыя утопіі (Т. Мор, Т. Кампанела).

**Фарміраванне навуковай карціны свету.** Вялікія адкрыцці М. Каперніка, Дж. Бруна, Г. Галілея. Уклад І. Ньютана ў стварэнне новай карціны свету. Вучэнне В. Гарвея аб зараджэнні жыцця. Узнікненне ідэй аб праве чалавека на жыццё, свабоду і ўласнасць.

**Культура эпохі Адраджэння.** Гуманізм твораў М. де Сервантэса, В. Шэкспіра і Ф. Рабле. Творы народнай творчасці. Тытаны італьянскага Адраджэння: Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла Буанароці, Рафаэль Санці. Гуманістычныя ідэалы ў творчасці прадстаўнікоў Паўночнага Рэнесансу. І. Босх, П. Брэйгель Старэйшы, А. Дзюрэр.

**Рэфармацыя ў Германіі.** Каталіцкая царква і прычыны Рэфармацыі. Вучэнне М. Лютэра. Сялянская вайна ў Германіі. Утварэнне лютэранскай царквы.

**Рэфармацыя і рэлігійныя войны ў Еўропе.** Распаўсюджанне Рэфармацыі ў Еўропе. Кальвінізм і англіканская царква. Варфаламееўская ноч у Францыі. Контррэфармацыя.

**Рэвалюцыя ў Нідэрландах.** Эканамічныя і рэлігійныя супярэчнасці з Іспаніяй. Іканаборскае паўстанне. Вызваленчая вайна супраць іспанскага панавання. Утрэхцкая унія. Нараджэнне незалежнай рэспублікі.

### Т э м а 2. **Заходняя Еўропа ў XVII—XVIII стст.** (9 гадзін)

**Асноўныя рысы эканамічнага развіцця.** Рост гарадоў і гандлю. Узнікненне і развіццё мануфактур. Капіталістычнае прадпрыемства. Пачатак новай стадыі прамысловага развіцця.

**Паўсядзённае жыццё еўрапейцаў.** Насельніцтва Еўропы. Новыя з’явы ў паўсядзённым жыцці. Еўрапейскі горад. Сялянская Еўропа.

**Дзяржава ў XVII—XVIII стст.** Формы дзяржаўнага кіравання. Сацыяльная апора дзяржавы. Каралі і парламенты. Умацненне і росквіт абсалютызму.

**Еўрапейскія канфлікты і войны.** Саперніцтва паміж еўрапейскімі дзяржавамі. Трыццацігадовая вайна (1618—1648). Вайна за іспанскую спадчыну (1701—1714). Сямігадовая вайна (1756—1763) і яе наступствы.

**Англійская буржуазная рэвалюцыя XVII ст.** Прычыны і пачатак рэвалюцыі. Грамадзянская вайна. Рэспубліка і пратэктарат Кромвеля. Рэстаўрацыя Сцюартаў. Гістарычнае значэнне англійскай буржуазнай рэвалюцыі.

**Эпоха Асветніцтва.** Сутнасць Асветніцтва. Тэорыя натуральнага права. Ідэі грамадскага дагавору і падзелу ўлады. Найбуйнейшыя прадстаўнікі Асветніцтва. Асветніцкі абсалютызм.

**Еўрапейская літаратура і мастацтва XVII—XVIII стст.** Дасягненні літаратуры, жывапісу і музыкі. Д. Дэфо і Дж. Свіфт аб героях свайго часу. Ідэі Асветніцтва ў творах П. Бамаршэ, Ф. Шылера і І. В. Гётэ. Еўрапейскае грамадства на палотнах мастакоў. Вяршыня музычнага мастацтва: І. С. Бах, В. А. Моцарт.

**Вялікая французская рэвалюцыя XVIII ст.** Прычыны і пачатак рэвалюцыі. Палітычныя пераўтварэнні. Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна і Канстытуцыя 1791 г. Звяржэнне манархіі і ўстанаўленне рэспублікі. Прыход да ўлады якабінцаў. М. Рабесп'ер. Падзенне якабінскай дыктатуры. Ад тэрмідора да ваеннай дыктатуры Напалеона Банапарта. Гістарычнае значэнне Вялікай французскай рэвалюцыі.

***Асноўныя паняцці:*** Рэнесанс, Рэфармацыя, сялянская вайна, пратэстантызм, рэлігійная вайна, Контррэфармацыя, езуіты, мануфактура, наёмныя рабочыя, капіталізм, манаполія, буржуазія, першапачатковае накапленне капіталу, прамысловая рэвалюцыя, індустрыяльная цывілізацыя, абсалютызм, Англійская буржуазная рэвалюцыя, барока, класіцызм, Вялікая французская рэвалюцыя, Асветніцтва, асветніцкі абсалютызм, рэвалюцыйная дыктатура, ваенная дыктатура, Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна, якабінская дыктатура.

## РАЗДЗЕЛ II
## **АМЕРЫКА** (3 гадзіны)

**Англійскія калоніі ў Паўночнай Амерыцы.** Першыя калоніі і іх жыхары. Лёс індзейскага насельніцтва. Гаспадарчае і палітычнае жыццё. Развіццё культуры. Амерыканскія асветнікі. Б. Франклін.

**Вайна за незалежнасць і ўтварэнне Злучаных Штатаў Амерыкі.** Рост супярэчнасцей паміж калоніямі і Англіяй. Пачатак вайны за незалежнасць. Дж. Вашынгтон. Дэкларацыя незалежнасці. Т. Джэферсан. Вынікі і значэнне вайны за незалежнасць. Канстытуцыя 1787 г.

**Лацінская Амерыка.** Эканамічнае жыццё еўрапейскіх калоній. Крэолы. Становішча карэннага насельніцтва. Чорныя нявольнікі. Каталіцкая царква. Культура каланіяльнага перыяду.

***Асноўныя паняцці:*** калонія, гандаль рабамі, плантацыйная гаспадарка, фермерская гаспадарка, метраполія, экспансія, еўрапейская каланізацыя, Дэкларацыя незалежнасці, федэратыўная дзяржава, дыскрымінацыя, каланіяльная імперыя.

**Урок абагульнення** (1 гадзіна)

## РАЗДЗЕЛ III
## РАСІЯ (7 гадзін)

**Расійская дзяржава ў XVI ст.** Завяршэнне аб'яднання рускіх зямель. Выбраная рада і рэформы 50-х гг. XVI ст. Лівонская вайна. Апрычніна. Цар Іван Грозны. «Масква — трэці Рым».

**Расія ў пачатку XVII ст. «Смутны час».** Праўленне Барыса Гадунова і перадумовы «смуты». Пачатак грамадзянскай вайны. Самазванцы. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай і Швецыі ў Расію. Апалчэнне К. Мініна і Д. Пажарскага. Канец «смуты».

**Пачатак праўлення Раманавых.** Выбранне царом Міхаіла Фёдаравіча Раманава. Земскія саборы. Саборнае ўлажэнне 1649 г. і ўзмацненне прыгонніцтва. Цар Аляксей Міхайлавіч. Паўстанне пад кіраўніцтвам С. Разіна. Новыя рысы ў расійскай эканоміцы.

**Эпоха Пятра Вялікага.** Перадумовы рэформаў. Пачатак праўлення Пятра І. Паўночная вайна (1700—1721). Ваенна-эканамічныя пераўтварэнні. Рэформы ў кіраванні дзяржавай. Асоба Пятра І.

**Праўленне Кацярыны ІІ.** Дварцовыя перавароты ў Расіі і прыход да ўлады Кацярыны ІІ. Умацаванне феадальнага землеўладання. Маніфест аб вольнасці дваранства. Паўстанне пад кіраўніцтвам Е. Пугачова. Знешняя палітыка Кацярыны ІІ. Палітыка асветніцкага абсалютызму.

**Развіццё расійскай культуры ў XVI—XVIII стст.** Фальклор і літаратура. Асветніцтва. Архітэктура. Тэатр. Выяўленчае мастацтва. Перамены ў побыце.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** Выбраная рада, Земскі сабор, апрычніна, «Смутны час», сялянскае паўстанне, інтэрвенцыя, Саборнае ўлажэнне, абсалютызм, рэформа, Сенат, Сінод, калегіі, дварцовыя перавароты, Маніфест аб вольнасці дваранства.

Р А З Д З Е Л IV

## **КРАІНЫ АЗІІ І АФРЫКІ** (5 гадзін)

**Японія.** Аб'яднанне Японіі пад уладай Такугавы. Самураі і сяляне. Адносіны з еўрапейцамі і палітыка самаізаляцыі. Культура.

**Кітай.** Заваяванне Кітая маньчжурамі. Грамадскі і дзяржаўны лад Цынскай імперыі. Абмежаванне кантактаў з еўрапейцамі. Развіццё культуры.

**Індыя.** Утварэнне імперыі Вялікіх Маголаў. Праўленне Акбара. Барацьба еўрапейскіх дзяржаў за панаванне ў Індыі. Культура Індыі магольскага перыяду.

**Асманская імперыя.** Заваяванні туркаў-асманаў. «Залаты век» Асманскай імперыі. Роля ісламу. Адносіны да Еўропы і еўрапейцаў. Крызісныя з'явы ў Асманскай імперыі ў XVIII ст. Славянскія краіны пад уладай Асманаў.

**Афрыка.** Грамадскі і дзяржаўны лад афрыканскіх народаў. Пранікненне еўрапейцаў. Гандаль рабамі і яго наступствы. Культура афрыканскіх народаў.

***Асноўныя паняцці:*** сёгунат, самаізаляцыя, гандлёвая факторыя, імперыя Вялікіх Маголаў.

**Выніковае абагульненне** (1 гадзіна)

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: ДРУГАЯ ПАЛОВА XVI—XVIII ст.

**(35 гадзін, у тым ліку 1 гадзіна — рэзервовы час)**

Р А З Д З Е Л I

## **БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст.** (12 гадзін)

**Лівонская вайна.** Прычыны і пачатак. Поспехі войска Расійскай дзяржавы. Страта Полацка. Ваенныя дзеянні ў 1579—1581 гг. Заключэнне і ўмовы Ям-Запольскага перамір'я (1582).

**Утварэнне Рэчы Паспалітай.** Перадумовы аб'яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай. Люблінскі сейм. Спрэчкі аб умовах уніі. Уключэнне часткі зямель ВКЛ у склад Каралеўства Польскага. Акт 1 ліпеня 1569 г. Умовы аб'яднання Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага.

**Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай.** Найвышэйшыя органы дзяржаўнай улады. Сейм Рэчы Паспалітай. Кароль Рэчы Паспалітай. «Залатыя вольнасці» шляхты. Фарміраванне адзінага шляхецкага саслоўя ў Рэчы Паспалітай.

**Палітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI — пачатку XVII ст.** Рэакцыя ВКЛ на вынікі уніі з Польшчай. Захаванне агульнадзяржаўных соймаў ВКЛ. Стварэнне Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Распрацоўка і прыняцце III Статута ВКЛ 1588 г. і яго значэнне.

**Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.** Барацьба са Швецыяй: вайна 1600—1629 гг. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву. Дэўлінскае перамір'е (1618). «Смаленская» вайна. Паляноўскі мір (1634).

**Сельская гаспадарка ў другой палове XVI — першай палове XVII ст.** Заняткі сялян. Уплыў гаспадарчых працэсаў у краінах Заходняй Еўропы на эканоміку ВКЛ. Станаўленне фальваркова-паншчыннай сістэмы гаспадарання. «Валочная памера» 1557 г. Феадальныя павіннасці і дзяржаўныя падаткі сялян. Сацыяльныя супярэчнасці і канфлікты ў вёсцы.

**Гарадское жыццё ў другой палове XVI — першай палове XVII ст.** Колькасны рост гарадскіх пасяленняў. Гарадское рамяство. Цэхі. Купецкія карпарацыі. Унутраны і знешні гандаль. Сацыяльныя канфлікты ў гарадах.

**Рэфармацыя ў Беларусі.** Перадумовы рэфармацыйнага руху. Пашырэнне Рэфармацыі ў Беларусі. Асноўныя кірункі рэфармацыйнага руху на Беларусі. Кальвінізм. Арыянства. Дзеячы Рэфармацыі (Мікалай Радзівіл Чорны, С. Будны, В. Цяпінскі). Вынікі і значэнне рэфармацыйнага руху.

**Контррэфармацыя ў Беларусі.** Асноўныя кірункі Контррэфармацыі. Пачатак і пашырэнне дзейнасці ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі. П. Скарга. Вынікі Контррэфармацыі ў Беларусі.

**Берасцейская царкоўная унія.** Перадумовы заключэння. Падрыхтоўка. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. і яго значэнне. Гвалтоўнае насаджэнне уніяцкай царквы ў канцы XVI — пачатку XVII ст. Уніяцкія дзеячы (І. Кунцэвіч). Пашырэнне уніяцтва сярод сельскага насельніцтва і гарадскіх нізоў.

**Пашырэнне ўплыву Адраджэння на беларускія землі.** Кнігадрукаванне. Літаратура рэлігійная і свецкая. Грамадска-палітычная і філасофская думка. Выяўленчае мастацтва. Дойлідства.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** Рэч Паспалітая, аграрная рэформа, шляхецкія вольнасці, федэрацыя, сенат, «пасольская ізба», арыянства, «Пакта канвента», «Генрыкавы артыкулы», ліберум вета, фальварак, валока, новалацінская паэзія, кальвінізм, клерыкалізацыя, уніяцтва, Галоўны Трыбунал ВКЛ.

## РАЗДЗЕЛ II
## БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.
(11 гадзін)

**Казацка-сялянская вайна 1648—1651 гг. на беларускіх землях.** Прычыны вайны і сувязь з паўстаннем пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага ва Украіне. Казацкія «загоны» ў Беларусі. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў супраць шляхецкага войска на поўдні Беларусі. Бітва пад Лоевам. Вынікі і наступствы казацка-сялянскай вайны.

**Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай у 1654—1667 гг.** Прычыны вайны і суадносіны сіл. Пачатак баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. Палітыка цара Аляксея Міхайлавіча. Кейданская унія 1655 г. Баявыя дзеянні ў першай палове 1660-х гг. Віленскае перамір'е. Вызваленне тэрыторыі Беларусі. Андросаўскае перамір'е.

**Беларусь у Паўночнай вайне.** Афармленне Паўночнага саюза. Прэабражэнскі дагавор. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Раскол шляхты. Бітва каля вёскі Лясная. Бедствы насельніцтва Беларусі. Вынікі і наступствы вайны.

**Барацьба магнацкіх груповак.** Пашырэнне шляхецкай анархіі. Канфлікты паміж магнацкімі родамі. Вайна 1696—1700 гг. Стварэнне шляхецкіх канфедэрацый прыхільнікаў Аўгуста II і Станіслава Ляшчынскага ў гады другой Паўночнай вайны. Сейм 1717 г. і яго значэнне. Вайна 1733—1739 гг.

**Беларуская вёска ў другой палове XVII — першай палове XVIII ст.** Заняпад вёскі ў час ваеннага ліхалецця другой паловы XVII — пачатку XVIII ст. Шляхі нармалізацыі гаспадарчага жыцця. Аднаўленне сялянскай гаспадаркі. Рост прыгонніцкай эксплуатацыі сялян. Павіннасці і паборы. Юрыдычнае становішча сялянства.

**Сялянскі рух.** Супраціўленне сялян узмацненню феадальнага прыгнёту. Формы антыфеадальнай барацьбы. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам В. Вашчылы ў Крычаўскім старостве. Паўстанне на Каменшчыне.

**Гарады Беларусі ў другой палове XVII — першай палове XVIII ст.** Заняпад гарадскога жыцця ў час ваеннага ліхалецця і яго паступовае аднаўленне. Гарады ў першай палове XVIII ст. Гандаль у першай палове XVIII ст. Першыя кірмашы. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці.

**Адукацыя і навука.** Гістарычныя ўмовы развіцця культуры. Забарона на ўжыванне беларускай мовы ў справаводстве. Праваслаўныя брацтвы і іх дзейнасць. Сістэма адукацыі (каталіцкія, пратэстанцкія, праваслаўныя, уніяцкія школы). Віленская акадэмія. Навука: А. Дубовіч, К. Семяновіч, І. Капіевіч.

**Літаратура і грамадска-палітычная думка.** Мясцовае летапісанне. Мемуарыстыка. Палітычная сатыра. Барока ў літаратуры: М. Сарбеўскі. Творчасць Сімяона Полацкага. Грамадска-палітычная думка: К. Лышчынскі.

**Архітэктура і мастацтва.** Барока ў архітэктуры Беларусі. Віленскае барока. Партрэтны жанр. «Сармацкі партрэт». І. Шрэтар. Батлейка. Школьны тэатр. Царкоўная музыка. «Полацкі сшытак». Арганная музыка. Капэлы.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** казакі, шляхецкая канфедэрацыя, «нямы» сейм, эканомія, калегіум, дыярыуш, сілабічная паэзія, віленскае барока, кірмаш.

## РАЗДЗЕЛ III
## БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст. (9 гадзін)

**Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай.** С. Панятоўскі — апошні кароль Рэчы Паспалітай. Умяшальніцтва суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Дысідэнцкае пытанне. Барацьба з Барскай канфедэрацыяй. Першы падзел Рэчы Паспалітай.

**Спробы рэфармавання Рэчы Паспалітай.** «Чатырохгадовы сейм» (1788—1792) і яго значэнне. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Таргавіцкая канфедэрацыя. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

**Паўстанне 1794 г. і яго падзеі ў Беларусі. Канец Рэчы Паспалітай.** Падрыхтоўка, пачатак і мэты паўстання. Т. Касцюшка. Ход паўстання. Я. Ясінскі, М. Клеафас Агінскі. Паражэнне паўстання. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.

**Эканамічная стабілізацыя ў другой палове XVIII ст.** Феадальная гаспадарка. Спробы эканамічных рэформаў у другой палове 60-х гг. XVIII ст. Аграрная рэформа А. Тызенгаўза (1765). Стан гарадоў. Магнацкае прадпрымальніцтва: І. Храптовіч, М. Казімір Радзівіл.

**Адукацыя і навука.** Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі. Рэформа школ ордэна піяраў. Стварэнне і дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Арганізацыя першых прафесійных навучальных устаноў. Развіццё навукі: К. Нарбут, М. Карповіч, А. Нарушэвіч, М. Пачобут-Адляніцкі.

**Літаратура і мастацтва.** Усталяванне польскай пісьмовай традыцыі ў літаратуры. Інтэрмедыі К. Марашэўскага і М. Цяцерскага. Друк. «Газета Гродзенска». Палацава-замкавае будаўніцтва. Прыгонны тэатр. Выяўленчае мастацтва. Віленская мастацкая школа: Ф. Смуглевіч, Я. Рустэм. Музычнае мастацтва. Прыгонныя капэлы і аркестры.

**Народная культура.** Асаблівасці развіцця народнай культуры. Побыт сялян і мяшчан. Светапогляд і абраднасць жыхароў вёскі і горада. Фальклор.

**Наш край**

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** касінеры, прыгонны тэатр, класіцызм, другі «нямы» сейм, фізіякраты, «вайна фрака і жупана», ды-

сідэнты, «кардынальныя правы», «Вялікі» сейм, «віленскія якабінцы», Адукацыйная камісія, Асветніцтва.

## **Выніковае абагульненне** (2 гадзіны)

### СПОСАБЫ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ЗАСВОІЦЬ ВУЧНІ VIII КЛАСА

называць храналагічныя рамкі гістарычных падзей, з'яў, вызначаць у іх асобныя этапы і перыяды;

вызначаць паслядоўнасць, працягласць і сінхроннасць гістарычных падзей, з'яў;

вызначаць у гістарычных тэкстах структуру гістарычнага часу (эпоха, перыяд, стагоддзе, год);

вызначаць месцазнаходжанне вывучаемых гістарычных аб'ектаў, выяўляць змяненні на гістарычнай карце;

характарызаваць гістарычныя падзеі і дзейнасць гістарычных асоб;

параўноўваць гістарычныя падзеі, з'явы па ўказаных крытэрыях;

раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі;

абагульняць гістарычныя факты, фармуляваць на іх аснове вывады;

класіфікаваць і сістэматызаваць гістарычныя факты і паняцці;

пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

раскрываць змест гістарычных паняццяў;

канкрэтызаваць гістарычныя паняцці.

# IX КЛАС

## СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НОВАГА ЧАСУ: XIX — ПАЧАТАК XX ст.

**(35 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)**

### **Уводзіны** (1 гадзіна)

Народы свету і цывілізацыі ў XIX — пачатку XX ст. Агульная характарыстыка другога перыяду Новага часу. Рост насельніцтва. Стварэнне індустрыяльнай цывілізацыі. Каланіяльны падзел свету.

***Асноўныя паняцці:*** індустрыяльная цывілізацыя, мадэрнізацыя.

### РАЗДЗЕЛ I
### **ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА** (10 гадзін)

**Заходняя Еўропа ў пачатку XIX ст.** Устанаўленне дыктатуры Напалеона Банапарта ў Францыі. Напалеонаўскія войны. Венскі кангрэс і стварэнне Свяшчэннага саюза.

**Асноўныя рысы эканамічнага развіцця.** Прамысловая рэвалюцыя і яе наступствы. Тэхнічны прагрэс у прамысловасці і земляробстве. Рост гарадоў. Змены ў сацыяльнай структуры еўрапейскага грамадства. Пераход ад свабоднай канкурэнцыі да манаполіі.

**Англія ў XIX — пачатку XX ст.** Эканамічнае развіццё. Дзяржаўны лад. Унутраная і знешняя палітыка лібералаў і кансерватараў. Рабочы рух. Чартызм і трэд-юніанізм. Утварэнне лейбарысцкай партыі.

**Францыя ў XIX — пачатку XX ст.** Эканамічнае і палітычнае развіццё. Рэвалюцыйныя падзеі: ад Ліпеньскай рэвалюцыі 1830 г. да рэвалюцыі 4 верасня 1871 г. Трэцяя рэспубліка ў 1871—1918 гг. Знешняя палітыка. Рабочы і сацыялістычны рух.

**Еўрапейскія рэвалюцыі 1848—1849 гг. і іх вынікі.** Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей. Лібералізм і рэвалюцыя. Перамогі, паражэнні і вынікі рэвалюцый у Германіі, Італіі і Аўстрыйскай імперыі.

**Германія ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Аб'яднанне Германіі і абвяшчэнне Германскай імперыі. Эканамічнае развіццё. Палітычны лад. Унутраная і знешняя палітыка.

**Міжнародны рабочы і сацыялістычны рух у другой палове XIX — пачатку XX ст.** Узнікненне марксізму. I і II Інтэрнацыяналы. Плыні ў рабочым і сацыялістычным руху. Заваяванні рабочага класа.

**Адукацыя, навука і тэхніка.** Развіццё адукацыі і навукі. Фарміраванне новай карціны свету. Пераварот у тэхніцы. Машынабудаванне і транспарт. Сродкі сувязі. Кінематограф. Сувязь навукі з практыкай і змяненні ў ладзе жыцця людзей.

**Мастацкая літаратура.** Рамантызм. Лідэр французскага рамантызму В. Гюго. Англійскія паэты-рамантыкі (Дж. Г. Байран, П. Б. Шэлі). В. Скот. Нямецкі рамантызм (Э. Т. А. Гофман, Г. Гейнэ). Рэалізм. Стэндаль, А. дэ Бальзак, Ч. Дзікенс. Дэкаданс. Творчасць французскіх паэтаў другой паловы XIX ст. (Ш. Бадлер, А. Рэмбо, П. Верлен, Г. Апалінэр). Р. Кіплінг.

**Жывапіс, музыка, архітэктура.** Рамантызм і рэалізм у жывапісе. Ф. Гоя, Э. Дэлакруа, Г. Курбэ і Ж. Міле. Імпрэсіянізм і постімпрэсіянізм. А. Рэнуар, К. Манэ, Э. Дэга, В. Ван Гог, П. Сезан, П. Гаген. Сімвалізм. А. Радэн. Музыка. Архітэктура.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** індустрыялізацыя, прамысловая рэвалюцыя, капіталістычныя эканамічныя адносіны, «венская сістэма», пралетарыят, мілітарызацыя эканомікі, манапалістычны капіталізм (імперыялізм), канстытуцыйная (парламенцкая) манархія, буржуазная дэмакратыя, палітычная партыя, чартызм, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, рэвалюцыя 4 верасня 1870 г., Трэцяя рэспубліка, Парыжская камуна, лібералізм, кансерватызм, сацыял-дэмакратызм, марксізм, нацыяналізм, нацыя, класы грамадскія, эксплуатацыя, Міжнароднае таварыства рабочых (Інтэрнацыянал), навуковая карціна свету, рамантызм, рэалізм, імпрэсіянізм, сімвалізм, неакласіцызм, мадэрн.

## РАЗДЗЕЛ II
## КРАІНЫ ПАЎНОЧНАЙ І ПАЎДНЁВАЙ АМЕРЫКІ (4 гадзіны)

**ЗША ў першай палове XIX ст.** Рост насельніцтва і пашырэнне тэрыторыі ЗША. Заваяванне «дзікага» Захаду. Поўнач і Поўдзень — два шляхі развіцця. Фермерская гаспадарка. Рух за адмену рабства.

**Ператварэнне ЗША ў сусветную дзяржаву.** Грамадзянская вайна (1861—1865) і яе вынікі. Эканамічнае і палітычнае развіццё ЗША пасля Грамадзянскай вайны. Знешняя палітыка ЗША.

**Амерыканская літаратура і мастацтва.** Амерыканскі рамантызм і яго асаблівасці. Г. Лангфела і Ф. Купер. Амерыканскі рэалізм (Г. Бічэр-Стоу, М. Твэн, Б. Гарт, Дж. Лондан, Т. Драйзер). Жывапіс. Архітэктура.

**Лацінская Амерыка.** Вайна за незалежнасць іспанскіх калоній (1810—1826). Эканамічнае і палітычнае развіццё самастойных лацінаамерыканскіх рэспублік. Рэвалюцыя ў Мексіцы (1910—1917). Развіццё лацінаамерыканскай культуры.

***Асноўныя паняцці:*** фермерская гаспадарка, абаліцыянізм, канфедэрацыя, рэзервацыя, нацыянальная культура.

## РАЗДЗЕЛ III
## РАСІЙСКАЯ ДЗЯРЖАВА І СЛАВЯНСКІЯ КРАІНЫ (9 гадзін)

**Расія ў першай палове XIX ст.** Грамадства і дзяржаўны лад. Аляксандр I. Айчынная вайна 1812 г. Дваранскія рэвалюцыянеры. Самадзяржаўе Мікалая I. Грамадскі рух 1830—1840-х гг. Знешняя палітыка. Крымская вайна і яе вынікі.

**Навука і культура ў першай палове XIX ст.** Навука і асвета. Літаратура. Архітэктура і скульптура. Выяўленчае мастацтва. Тэатр і музыка.

**Унутраная і знешняя палітыка Расіі ў другой палове XIX ст.** Праўленне Аляксандра II. Адмена прыгоннага права. Рэформы мясцовага самакіравання. Судовая, цэнзурная, школьная, ваенная рэформы. Вынікі і гістарычнае значэнне рэформаў. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі.

**Рэвалюцыйны рух і палітыка царызму.** Рэвалюцыйнае народніцтва. Аляксандр III і контррэформы. Пачатак рабочага і марксісцкага руху. Узнікненне расійскай сацыял-дэмакратыі.

**Расія на мяжы стагоддзяў.** Развіццё эканомікі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Прамысловасць і сельская гаспадарка. Змены ў сацыяльнай структуры грамадства. Мікалай II. Знешняя палітыка Расіі. Руска-японская вайна і яе вынікі.

**Расія ў гады рэвалюцыйных падзей (1905—1917).** Рэвалюцыя 1905—1907 гг. і яе вынікі. Дзяржаўная дума. Першая сусветная вайна і крызіс расійскай манархіі. Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. Падзенне самадзяржаўя. Расія напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.

**Руская культура ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Развіццё навукі і асветы. Літаратура. Музыка. Жывапіс. «Сярэбраны век» рускай культуры і яе сусветнае прызнанне.

**Барацьба славянскіх народаў за нацыянальную незалежнасць у XIX — пачатку XX ст.** Славянскія землі ў складзе Прусіі, Аўстрыі, Расіі і Асманскай імперыі. Адраджэнне славянскіх нацыянальных культур. Складванне нацыянальнай самасвядомасці. Руска-турэцкія войны і іх вынікі. Нацыянальна-вызваленчы рух заходніх славян.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** Айчынная вайна 1812 г., дзекабрысты, народніцтва, самадзяржаўе, заходнікі, славянафілы, разначынцы, буржуазныя рэформы, рэвалюцыйныя дэмакраты, перадзвіжнікі, крызіс феадалізму, земства, Дзяржаўная дума, нацыянальна-вызваленчы рух, Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, Кастрычніцкая рэвалюцыя.

## РАЗДЗЕЛ IV
## КРАІНЫ АЗІІ І АФРЫКІ (6 гадзін)

**Японія.** Рэвалюцыя 1868 г. і крызіс сёгуната Такугавы. Рэформы і канстытуцыя. Змены ў ладзе жыцця японскага грамадства. Рост нацыяналізму. Знешнепалітычная экспансія і яе вынікі. Культура.

**Кітай.** Першая «опіумная» вайна. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей. Паўстанне тайпінаў (1850—1864). Другая «опі-

умная» вайна. Рэфарматарскі рух. Паўстанне іхэтуаней. Сунь Ятсен. Сіньхайская рэвалюцыя 1911—1912 гг. Звяржэнне манархіі ў Кітаі і абвяшчэнне Кітайскай рэспублікі. Культура.

**Індыя.** Індыя — англійская калонія. Антыкаланіяльнае паўстанне 1857—1859 гг. Індыйскі нацыянальны кангрэс. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў пачатку XX ст. Культура.

**Мусульманскі свет.** Пранікненне еўрапейскіх дзяржаў у мусульманскія краіны. Англа-афганскія войны. Нацыянальна-вызваленчы рух, рэформы і рэвалюцыі. Новае ў культуры і ладзе жыцця мусульманскіх краін.

**Тэрытарыяльны падзел Афрыкі ў XIX ст.** Барацьба еўрапейскіх дзяржаў за падзел Афрыкі. Берлінская канферэнцыя (1884—1885) і «вялікае афрыканскае паляванне». Барацьба Эфіопіі супраць еўрапейскай каланізацыі. Англа-бурская вайна.

***Асноўныя паняцці:*** каланіялізм, «опіумная» вайна, паўстанне тайпінаў, паўстанне іхэтуаней, суньятсенізм, антыкаланіяльны рух, рынак збыту, пратэктарат, дамініён, Індыйскі нацыянальны кангрэс.

## РАЗДЗЕЛ V
## **ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА** (2 гадзіны)

**Пачатак Першай сусветнай вайны.** Абвастрэнне міжнародных супярэчнасцей і наспяванне вайны ў Еўропе. Утварэнне Траістага саюза і Антанты. Пачатак Першай сусветнай вайны. Планы Германіі. Ход ваенных дзеянняў у 1915—1916 гг.

**Галоўныя палітычныя падзеі і ход ваенных дзеянняў у 1917—1918 гг.** Наспяванне палітычнага крызісу ў ваюючых краінах. Уступленне ў вайну ЗША. Ход ваенных дзеянняў у 1917 г. Заключны перыяд вайны. Асноўныя вынікі Першай сусветнай вайны.

***Асноўныя паняцці:*** Першая сусветная вайна, Траісты саюз, Антанта, палітычны крызіс, Камп’енскае перамір’е.

### **Выніковае абагульненне** (1 гадзіна)

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: КАНЕЦ XVIII — ПАЧАТАК XX ст.

**(35 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)**

## РАЗДЗЕЛ І
## БЕЛАРУСЬ НА ЗЫХОДЗЕ ФЕАДАЛІЗМУ: КАНЕЦ XVIII — СЯРЭДЗІНА XIX ст. (12 гадзін)

**Становішча беларускіх зямель у канцы XVIII — сярэдзіне XIX ст.** Пачатак новага перыяду ў гісторыі Беларусі. Грамадска-палітычная сітуацыя. Сацыяльна-эканамічныя працэсы. Асаблівасці канфесійнага становішча і развіцця культуры.

**Палітыка расійскага ўрада ў Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XIX ст.** Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Саслоўная палітыка расійскага ўрада. Эканамічныя змены. Падаткі і павіннасці. Абмежавальныя законы ў адносінах да яўрэяў. Ваенныя пасяленні.

**Беларусь у перыяд Айчыннай вайны 1812 г.** Баявыя дзеянні летам 1812 г. Становішча насельніцтва Беларусі ў час вайны. Палітыка акупацыйных французскіх улад. Выгнанне напалеонаўскай арміі. Вынікі вайны для Беларусі.

**Грамадска-палітычны рух у першай трэці XIX ст.** Стварэнне і дзейнасць тайных арганізацый у Беларусі: філаматы і філарэты, дзекабрысты, «Таварыства ваенных сяброў». Прычыны, ход і вынікі паўстання 1830—1831 гг. на беларускіх землях.

**Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі ў 1830—1840-я гг.** Палітыка расійскага ўрада ў беларускіх губернях пасля паўстання 1830—1831 гг. Дэмакратызацыя грамадскага руху. Уплыў рэвалюцыйных падзей 1848—1849 гг. у Еўропе на грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі.

**Канфесійныя адносіны ў канцы XVIII — першай палове XIX ст.** Становішча канфесій Беларусі пасля далучэння да Расійскай імперыі. Першыя спробы пераводу ўніятаў у праваслаўе. Выгнанне езуітаў і абмежаванне ўплыву каталіцкай царквы. Ліквідацыя ўніяцкай царквы.

**Сельская гаспадарка і становішча сялян у першай палове XIX ст.** Новыя з'явы ў гаспадарчым жыцці вёскі. Сацыяльна-прававое становішча сялян. Формы і нормы павіннасцей.

**Рэформы ў сельскай гаспадарцы ў першай палове XIX ст.** Нарастанне сялянскіх выступленняў, іх антыпрыгонніцкі характар. Рэформа П. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы. Спробы ўрэгулявання павіннасцей памешчыцкіх сялян.

**Прамысловасць, гандаль, гарады і мястэчкі Беларусі ў першай палове XIX ст.** Формы прамысловай вытворчасці і пачатак прамысловага перавароту. Пашырэнне наёмнай працы. Развіццё шляхоў зносін і гандлю. Роля кірмашоў. Склад насельніцтва гарадоў, знешні выгляд гарадоў.

**Адукацыя і навука ў першай палове XIX ст.** Змены ў сістэме адукацыі. Тыпы школ. Вышэйшыя навучальныя ўстановы. Станаўленне навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ. П. Шпілеўскі, Я. Чачот, К. і Я. Тышкевічы.

**Літаратура і мастацтва ў першай палове XIX ст.** Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Літаратура. Польска-беларускія культурныя дзеячы: Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля. В. Дунін-Марцінкевіч. П. Багрым. Жывапіс: І. Аляшкевіч, І. Хруцкі, В. Ванькові. Тэатр і музыка: С. Манюшка, А. Абрамовіч. Архітэктура.

**Наш край**

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** аўтаномія, план Агінскага, філаматы, філарэты, шляхецкае паўстанне, «разбор» шляхты, мяжа яўрэйскай аседласці, Полацкі царкоўны сабор, сялянская абшчына, фальваркова-паншчынная сістэма, рэформа П. Кісялёва, інвентарная рэформа, беларусазнаўства, ланкастэрская школа.

## РАЗДЗЕЛ II
## УСТАЛЯВАННЕ КАПІТАЛІЗМУ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ: ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX — ПАЧАТАК XX ст. (21 гадзіна)

**Становішча Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.** Асаблівасці пераходу ад феадальнага да буржуазнага грамадства на беларускіх землях. Шляхі фарміравання буржуазнага грамадства. Нацыянальнае пытанне і самасвядомасць беларусаў.

**Адмена прыгоннага права.** Маніфест і Палажэнні 19 лютага 1861 г., парадак іх прымянення ў Беларусі. Рэфармаванне дзяржаўнай вёскі. Рэакцыя сялянства. Вынікі і значэнне ажыццяўлення рэформы 1861 г.

**Паўстанне 1863—1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі.** Прычыны і характар паўстання. «Чырвоныя» і «белыя». Праграма К. Каліноўскага. «Мужыцкая праўда». Пачатак і ход паўстання, яго падаўленне. «Лісты з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага. Уплыў паўстання 1863—1864 гг. на ўмовы вызвалення сялян беларускіх губерняў ад прыгонніцтва.

**Урадавая палітыка ў Беларусі ў апошняй трэці XIX ст.** Сітуацыя ў беларускіх губернях пасля паўстання 1863—1864 гг. Асаблівасці правядзення буржуазных рэформаў у Беларусі. Палітыка расійскага ўрада па нацыянальна-рэлігійным пытанні. Заходнерусізм.

**Развіццё капіталістычных адносін у вёсцы пасля адмены прыгоннага права.** Рост буржуазнага землеўладання і асаблівасці гэтага працэсу ў Беларусі. Пераход да прадпрымальніцкай гаспадаркі. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Уплыў феадальных перажыткаў.

**Прамысловае развіццё і стан гарадоў у 1860-я гг. — пачатку XX ст.** Станаўленне фабрычнай вытворчасці. Спецыялізацыя прамысловасці. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі. Рост гарадоў. Змены ў складзе гарадскога насельніцтва. Гарадская рэформа.

**Развіццё гандлю, фінансаў, транспарту ў 1860-я гг. — пачатку XX ст.** Шляхі зносін і сродкі сувязі. Будаўніцтва чыгунак. Пашырэнне ўнутранага рынку. Развіццё гандлю. Станаўленне банкаў.

**Сялянскі і рабочы рух у другой палове XIX ст.** Становішча сялян. Формы і характар сялянскай барацьбы. Перасяленчы рух на свабодныя землі. Становішча рабочых. Уздым рабочага руху. Першыя палітычныя выступленні рабочых.

**Фарміраванне палітычных партый і рухаў.** Рэвалюцыйныя народнікі. Група «Гоман». Агульнарасійскія сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў Беларусі. Утварэнне і праграмныя патрабаванні Беларускай сацыялістычнай грамады.

**Першая расійская рэвалюцыя і падзеі 1905 г. у Беларусі.** Прычыны, пачатак і ход рэвалюцыі. Выступленні рабочых і

сялян. Дзейнасць палітычных партый і рухаў. Маніфест 17 кастрычніка і яго вынікі для Беларусі.

**Грамадска-палітычнае становішча ў Беларусі ў 1906—1914 гг.** Дэпутаты ад заходніх губерняў у Дзяржаўнай думе. Беларускі нацыянальны рух. Палітыка самадзяржаўя пасля паражэння рэвалюцыі 1905—1907 гг.

**Сталыпінскія рэформы і іх ажыццяўленне ў Беларусі.** Прычыны і мэты аграрнай рэформы. Разбурэнне сялянскай абшчыны. Распаўсюджанне хутарской сістэмы землекарыстання. Перасяленне сялян у азіяцкую частку Расіі. Увядзенне земстваў. Вынікі і значэнне рэформаў для Беларусі.

**Падзеі Першай сусветнай вайны на беларускіх землях.** Пачатак вайны. Настроі ў грамадстве. Акупацыя заходняй часткі Беларусі. Палітыка нямецкіх улад. Становішча насельніцтва Заходняй Беларусі. Беларускі нацыянальны рух.

**Наспяванне крызісу ў грамадстве. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі.** Ваеннае становішча ва ўсходняй частцы Беларусі. Бежанства. Заняпад сельскай гаспадаркі. Мілітарызацыя прамысловасці. Пачатак рэвалюцыі. Звяржэнне самадзяржаўя. Фарміраванне Саветаў і буржуазных органаў улады. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый.

**Абвастрэнне палітычнай сітуацыі ў Беларусі вясной—летам 1917 г.** Нарастанне супярэчнасцей у грамадстве. Беларускі нацыянальны рух. Карнілаўскі мяцеж.

**Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі.** Этнічная тэрыторыя. Нацыянальны і сацыяльны склад насельніцтва Беларусі. Агульнасць гаспадарчага жыцця. Развіццё беларускай літаратурнай мовы. Нацыянальная самасвядомасць. Роля газеты «Наша ніва» ў развіцці культуры Беларусі.

**Адукацыя і навука ў 60-я гг. XIX — пачатку XX ст.** Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Школьная рэформа. Навуковае вывучэнне этнаграфіі і мовы беларускага народа. П. Шэйн, І. Насовіч. Гістарычныя даследаванні. Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі.

**Беларуская літаратура і тэатр у 60-я гг. XIX — пачатку XX ст.** Развіццё беларускай літаратуры. Напрамкі творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. І. Буйніцкі.

**Жывапіс і архітэктура ў Беларусі ў 60-я гг. XIX — пачатку XX ст.** Жывапіс: К. Альхімовіч, Н. Орда, Н. Сілівановіч, А. Гараўскі, В. Бялыніцкі-Біруля, Ю. Пэн. Развіццё архітэктуры і горадабудаўніцтва.

**Урок абагульнення**

**Наш край**

***Асноўныя паняцці:*** часоваабавязаныя сяляне, цераспалосіца, адпрацоўкі, маёмасны цэнз, водруб, хутар, земствы, «Курлаўскі расстрэл», кааліцыйны камітэт, аўтанамісты, «Свянцянскі прарыў», заходнерусізм, «тутэйшыя», царкоўна-прыходская школа, настаўніцкая семінарыя, нацыянальнае пытанне, нацыянальная самасвядомасць, беларуская нацыянальная ідэя.

### СПОСАБЫ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ЗАСВОІЦЬ ВУЧНІ IX КЛАСА:

называць храналагічныя рамкі гістарычных падзей, з'яў, працэсаў, вызначаць у іх асобныя этапы і перыяды;

вызначаць паслядоўнасць, працягласць гістарычных падзей, з'яў, працэсаў;

вызначаць у гістарычных тэкстах структуру гістарычнага часу (эпоха, перыяд, стагоддзе, год);

вызначаць месцазнаходжанне вывучаемых гістарычных аб'ектаў, выяўляць змяненні на гістарычнай карце;

характарызаваць гістарычныя падзеі, дзейнасць гістарычных асоб;

характарызаваць палітычнае становішча краін;

параўноўваць гістарычныя падзеі, з'явы па ўказаных крытэрыях;

раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі, з'явамі, працэсамі;

абагульняць гістарычныя факты, фармуляваць на іх аснове вывады;

класіфікаваць і сістэматызаваць гістарычныя факты і паняцці;

пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

раскрываць значэнне гістарычных паняццяў;

канкрэтызаваць гістарычныя паняцці.

# X КЛАС

## СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ: 1918—1945 гг.

**(35 гадзін, у тым ліку 1 гадзіна — рэзервовы час)**

**Уводзіны** (1 гадзіна)

Паняцце «навейшая гісторыя» і яе перыядызацыя. Асноўныя тэндэнцыі сусветна-гістарычнага развіцця ў 1918—1945 гг. Уплыў Першай сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. на ход сусветнай гісторыі.

***Асноўныя паняцці:*** Навейшая гісторыя (гісторыя Навейшага часу).

### Р А З Д З Е Л I
### КРАІНЫ ЕЎРОПЫ І ЗША Ў 1918—1939 гг. (9 гадзін)

**Заходняя Еўропа ў 1918—1923 гг.** Народныя выступленні ў еўрапейскіх краінах. Узнікненне камуністычных партый, утварэнне III (Камуністычнага) Інтэрнацыянала. Распад Аўстра-Венгрыі. Лістападаўская буржуазная рэвалюцыя ў Германіі. Веймарская рэспубліка. Узнікненне фашысцкай партыі ў Германіі. Прыход фашыстаў да ўлады ў Італіі.

**Усталяванне асноў пасляваеннага свету.** Парыжская мірная канферэнцыя. Мірныя дагаворы 1919—1920 гг. Стварэнне Лігі Нацый. Вашынгтонская канферэнцыя. Рапальскі дагавор. Супярэчнасці Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін.

**Заходняя Еўропа і ЗША ў 1924—1929 гг.** Эканамічнае развіццё. Пашырэнне сацыяльнай палітыкі ўрадаў. Паляпшэнне ўмоў працы і матэрыяльнага становішча рабочых. Умацаванне парламентарнай сістэмы. Рост рэфармісцкіх настрояў. Стабілізацыя міжнародных адносін. План Даўэса. Лакарнская канферэнцыя. Пакт Брыяна—Келага. План Юнга.

**Сусветны эканамічны крызіс і краіны Заходняй Еўропы і ЗША ў 1929—1933 гг.** Глабальны характар эканамічнага крызісу і яго асаблівасці ў розных краінах. «Новы курс» у ЗША. Сацыяльна-палітычнае развіццё заходніх краін. Напрамкі выхаду з крызісу.

**Заходні свет напярэдадні Другой сусветнай вайны.** Устанаўленне фашысцкай дыктатуры ў Германіі. Унутраная палітыка нацыянал-сацыялістаў. Прыход да ўлады народных франтоў у Францыі і Іспаніі. Грамадзянская вайна ў Іспаніі.

**Міжнародныя адносіны ў 1930-я гг.** Крызіс Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Курс фашысцкай Германіі на перадзел свету. «Антыкамінтэрнаўскі пакт». Аншлюс Аўстрыі. Ачагі ваеннай напружанасці. Фарміраванне блока агрэсіўных дзяржаў. Мюнхенская канферэнцыя. Праблема стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе.

**Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы.** Утварэнне новых незалежных дзяржаў у Еўропе. Нацыянальныя праблемы. Праблема пераадолення адсталасці. Устанаўленне аўтарытарных рэжымаў. Акупацыя Чэхаславакіі. Польшча перад пагрозай германскай агрэсіі.

**Навука і культура заходніх краін у міжваенны перыяд.** Навукова-тэхнічны прагрэс. Поспехі фундаментальных навук. А. Эйнштэйн. Асноўныя тэндэнцыі развіцця грамадскіх навук. Працяг традыцый рэалізму ў літаратуры. Э. Хемінгуэй, Э. М. Рэмарк. Пошукі новых формаў у выяўленчым мастацтве. Кіно. Архітэктура.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** Веймарская рэспубліка, III (Камуністычны) Інтэрнацыянал, рэпарацыя, Версальскі мірны дагавор, дэмілітарызацыя, Ліга Нацый, Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін, пакт Брыяна—Келага, дэмакратызацыя палітычнай сістэмы, рурскі крызіс, Рэйнскі гарантыйны пакт, сусветны эканамічны крызіс, «новы курс» Рузвельта, фашызм, нацызм, расізм, таталітарны палітычны рэжым, Народны фронт, палітыка «супакаення», «Антыкамінтэрнаўскі пакт», аншлюс, Мюнхенскі дагавор, сістэма калектыўнай бяспекі, «Стальны пакт», савецка-германскі дагавор аб ненападзенні, аўтарытарны палітычны рэжым, масавая культура.

## РАЗДЗЕЛ II
## ГІСТОРЫЯ САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА: 1917—1939 гг.
(8 гадзін)

**Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне савецкай улады ў Расіі.** Курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне. Перамога паўстання ў Петраградзе і Маскве. II Усерасійскі з’езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і яго рашэнні. Утварэнне Савета Народных Камісараў (СНК). У. І. Ленін, роспуск Устаноўчага сходу. Устанаўленне Савецкай улады. Брэсцкі мір.

**Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя.** Прычыны і асноўныя этапы грамадзянскай вайны. Мяцеж Чэхаславацкага корпуса. Імперыялістычная інтэрвенцыя. Белы рух. А. В. Калчак. А. І. Дзянікін. Чырвоны рух. Л. Д. Троцкі. М. В. Фрунзе. Палітыка «ваеннага камунізму». Ваенныя дзеянні на франтах грамадзянскай вайны. Ваенна-палітычны саюз рэспублік. Польская інтэрвенцыя. Польска-савецкая вайна. Разгром арміі П. М. Урангеля, сіл інтэрвентаў і белагвардзейцаў на ўскраінах краіны. Вынікі грамадзянскай вайны. Узнікненне рускага замежжа.

**Новая эканамічная палітыка. Утварэнне СССР.** Эканамічны крызіс у краіне. Сутнасць і значэнне нэпа. Уздым народнай гаспадаркі. М. І. Бухарын. Пераадоленне Савецкай краінай палітычнай ізаляцыі на міжнароднай арэне. Прычыны ўтварэння Саюза ССР. Праекты аб’яднання савецкіх рэспублік. I Усесаюзны з’езд Саветаў і яго рашэнні. Канстытуцыя СССР 1924 г. Гістарычнае значэнне ўтварэння СССР.

**Курс на пабудову сацыялізму ў СССР. Індустрыялізацыя і калектывізацыя.** Згортванне нэпа і фарсіраваная рэканструкцыя народнай гаспадаркі. Сацыялістычнае спаборніцтва. Ажыццяўленне суцэльнай калектывізацыі. Індустрыялізацыя ў 1930-я гг. Вынікі першых пяцігодак. Змена сацыяльнай структуры грамадства.

**Унутраная і знешняя палітыка СССР у 1930-я гг.** Канцэнтрацыя заканадаўчай і выканаўчай улады ў руках партыйна-дзяржаўнага апарату. І. В. Сталін. Канстытуцыя СССР 1936 г. Палітычныя рэпрэсіі. СССР і праблема стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Узброеныя канфлікты

каля возера Хасан і ракі Халхін-Гол. Англа-франка-савецкія перагаворы 1939 г. Германа-савецкі пакт аб ненападзенні (жнівень 1939 г.). Умацаванне абароназдольнасці СССР.

**Ажыццяўленне культурных пераўтварэнняў.** Ліквідацыя масавай непісьменнасці. Стан сярэдняй і вышэйшай школы. Навуковыя адкрыцці І. П. Паўлава, М. І. Вавілава, У. І. Вярнадскага, К. Э. Цыялкоўскага, М. Я. Жукоўскага, А. А. Фрыдмана. Грамадскія навукі. Асаблівасці развіцця літаратуры і мастацтва. Сацыялістычны рэалізм. Сацыялістычная дзяржава і царква.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** Кастрычніцкая рэвалюцыя, сепаратны мір, бальшавізм, рэвалюцыйная дыктатура, грамадзянская вайна, палітыка «ваеннага камунізму», новая эканамічная палітыка (нэп), аўтаномія, федэрацыя, індустрыялізацыя, стаханаўскі рух, калектывізацыя.

## РАЗДЗЕЛ III
## КРАІНЫ УСХОДУ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ ПАМІЖ СУСВЕТНЫМІ ВОЙНАМІ (7 гадзін)

**Уплыў Камінтэрна і СССР на развіццё нацыянальна-вызваленчага руху.** Адносіны Савецкай Расіі да краін і народаў Усходу. Стратэгія і тактыка Камінтэрна ў нацыянальна-вызваленчым руху. Палітыка Захаду на Усходзе.

**Кітай.** Унутрыпалітычнае развіццё Кітая. Нацыянальная рэвалюцыя 1925—1928 гг. Чан Кайшы. Гаміньданаўскі Кітай. Дзейнасць Камуністычнай партыі Кітая (КПК). Агрэсія Японіі ў Кітаі. Развіццё культуры. Новыя з’явы ў ладзе жыцця.

**Індыя.** Рэвалюцыйны ўздым 1918—1922 гг. Рэформы англійскай адміністрацыі. М. Гандзі. Нацыянальна-вызваленчы рух у 1920—1930-я гг. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуры. Лад жыцця.

**Японія.** Эканамічнае і палітычнае развіццё ў 1920—1930-я гг. Мілітарызацыя Японіі ў 1930-я гг. Знешняя палітыка. Адукацыя і мастацкая культура. Лад жыцця і духоўныя каштоўнасці.

**Мусульманскі свет.** Сацыяльна-палітычнае становішча мусульманскага свету ў 1918—1939 гг. Нацыянальная рэвалюцыя ў Турцыі 1918—1923 гг. М. Кемаль. Барацьба егіпецкага народа за незалежнасць. Дасягненне незалежнасці Афганістанам. Асаблівасці культурнага развіцця мусульманскіх краін. Лад жыцця.

**Лацінская Амерыка.** Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Рабочы і сялянскі рух. Рэвалюцыйныя працэсы. Роля рэлігіі і царквы. Палітыка ЗША ў Лацінскай Амерыцы. Развіццё культуры.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** мандатная сістэма, суньятсенізм, гандзізм, япанізм (ніпанізм), кемалізм, фундаменталізм і рэфармізм у ісламе, сат’яграха.

## РАЗДЗЕЛ IV
## ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА. ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА САЮЗА (8 гадзін)

**Пачатак Другой сусветнай вайны.** Прычыны, характар вайны. Напад Германіі на Польшчу. Уступленне ў вайну з Германіяй Англіі і Францыі, пазіцыя ЗША. Захоп Германіяй Даніі і Нарвегіі. Паражэнне Францыі. Ваенныя дзеянні супраць Англіі. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР і Заходняй Украіны з УССР. Савецка-фінляндская вайна. Уваходжанне прыбалтыйскіх дзяржаў, Паўночнай Букавіны і Бесарабіі ў СССР. Акупацыя Югаславіі і Грэцыі фашысцкай Германіяй.

**Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.** Нападзенне Германіі на Савецкі Саюз. Правал стратэгіі «маланкавай вайны» супраць СССР. Блакада Ленінграда. Бітва пад Масквой і яе гістарычнае значэнне. Маскоўская канферэнцыя. Уступленне ЗША ў вайну. Стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі.

**Карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.** Рашаючыя перамогі Чырвонай Арміі пад Сталінградам і на Курскай дузе, іх міжнароднае значэнне. Ваенныя дзеянні армій ЗША і Англіі ў канцы 1942—1943 г. Наступленне саюзных войскаў у Афрыцы і Міжземнамор’і. Капі-

туляцыя Італіі. Вайна на Ціхім і Атлантычным акіянах. Пашырэнне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя.

**Барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі СССР.** Устанаўленне «новага парадку». Рух Супраціўлення ў акупіраваных краінах Еўропы. Роспуск Камінтэрна. Барацьба савецкага народа ў тыле ворага. Партызанскі рух і падпольная барацьба.

**Савецкі тыл у час вайны.** Перавод эканомікі на ваенны лад. Абаронная прамысловасць. Сельская гаспадарка. Працоўны гераізм савецкага народа. Уклад тылу ў перамогу ў вайне. Царква ў гады вайны. Паўсядзённае жыццё савецкіх людзей у тыле. Становішча ў блакадным Ленінградзе. Навука і культура ў гады вайны.

**Заключны этап Другой сусветнай вайны. Разгром фашысцкага блока (1944—1945).** Наступленне Чырвонай Арміі ў 1944 г. Адкрыццё другога фронту. Вызваленне Чырвонай Арміяй еўрапейскіх краін у 1944—1945 гг. Крымская канферэнцыя. Ваенныя дзеянні ў Заходняй Еўропе, Азіі і зоне Ціхага акіяна. Капітуляцыя Германіі.

Заснаванне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). Патсдамская канферэнцыя. Уступленне СССР у вайну супраць Японіі і яе разгром. Савецкае ваеннае майстэрства: Г. К. Жукаў, А. М. Васілеўскі, К. К. Ракасоўскі, І. С. Конеў, І. Х. Баграмян. Роля І. В. Сталіна. Асноўныя вынікі Другой сусветнай вайны. Сусветна-гістарычнае значэнне перамогі над фашызмам.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** Другая сусветная вайна, «дзіўная вайна», Траісты пакт, Вялікая Айчынная вайна, антыгітлераўская кааліцыя, ленд-ліз, карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, «новы парадак», генацыд, халакост, партызанскі і падпольны рух, Рух Супраціўлення, другі фронт, безагаворачная капітуляцыя, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, Нюрнбергскі трыбунал.

### **Выніковае абагульненне** (1 гадзіна)

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: 1917—1945 гг.

**(35 гадзін, у тым ліку 1 гадзіна — рэзервовы час)**

## РАЗДЗЕЛ І
## КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ. СТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (8 гадзін)

**Становішча ў Беларусі напярэдадні кастрычніка 1917 г.** Палітычная і сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі і на Заходнім фронце летам—восенню 1917 г. Перадумовы Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і станаўленне беларускай дзяржаўнасці.

**Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі на Заходнім фронце і ў Беларусі.** Пераход улады ў рукі Саветаў у Беларусі і на Заходнім фронце. Ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве. Фарміраванне і дзейнасць Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзаха). Дзейнасць Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту. А. Мяснікоў, К. Ландар. Першыя пераўтварэнні ў грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах. Палітыка ваеннага камунізму і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.

**Беларусь ва ўмовах германскай акупацыі.** Наступленне войскаў кайзераўскай Германіі і захоп Мінска. Брэсцкі мір. Устанаўленне германскага акупацыйнага рэжыму. Супраціўленне насельніцтва Беларусі акупантам. Вызваленне Беларусі.

**Абвяшчэнне і ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці.** Беларускі нацыянальны рух і яго асноўныя палітычныя напрамкі. Усебеларускі з'езд і яго рашэнні. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Дзейнасць рады БНР і яе ўзаемаадносіны з германскай ваеннай адміністрацыяй. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ). Першы Усебеларускі з'езд Саветаў і яго рашэнні. Канстытуцыя ССРБ 1919 г. Утварэнне Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел).

**Польска-савецкая вайна 1919—1920 гг.** Наступленне польскіх войскаў у Беларусі. Асноўныя напрамкі барацьбы з поль-

скімі інтэрвентамі. Разгортванне партызанскага руху. Беларуская Камуністычная арганізацыя.

**Беларуская дзяржаўнасць ва ўмовах грамадзянскай вайны. Другое абвяшчэнне ССРБ.** Ваенныя дзеянні на польска-савецкім фронце ў 1920 г. Вызваленне войскамі Чырвонай Арміі тэрыторыі Беларусі. Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ 31 ліпеня 1920 г. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі.

**Наш край**

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь (ССРБ), Літоўска-Беларуская ССР (ЛітБел), Брэсцкі мірны дагавор, Рыжскі мірны дагавор, «Рудабельская рэспубліка», буферная дзяржава.

## РАЗДЗЕЛ II
## БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ СТАНАЎЛЕННЯ САВЕЦКАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ ПАД УЛАДАЙ ПОЛЬШЧЫ (14 гадзін)

**Становішча Беларусі ў міжваенны перыяд.** Асаблівасці палітычнай сітуацыі ў Беларусі ў міжваенны перыяд. Развіццё БССР у гады сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і культурнай рэвалюцыі.

**БССР у гады новай эканамічнай палітыкі.** Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі пасля Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Аднаўленне народнай гаспадаркі. Пераход да новай эканамічнай палітыкі. Погляды Д. Прышчэпава на шляхі пераўтварэнняў у вёсцы. Уплыў нэпа на развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці, транспарту.

**Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1920-я гг.** Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця. Роля КП(б)Б і Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў у палітычнай сістэме. Камуністычны саюз моладзі Беларусі. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза ССР. А. Чарвякоў. Значэнне ўтварэння СССР для Беларусі. Узбуйненне тэрыторыі БССР у 1924 і 1926 гг. Канстытуцыя БССР 1927 г.

**Палітыка беларусізацыі.** Беларусізацыя як састаўная частка савецкай нацыянальнай палітыкі. Напрамкі нацыянальнай палітыкі КП(б)Б. Асноўныя мерапрыемствы, супярэчнасці і вынікі беларусізацыі. Каранізацыя. Інстытут беларускай культуры. У. Ігнатоўскі. Значэнне палітыкі беларусізацыі.

**Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920-я гг.** Ліквідацыя масавай непісьменнасці дарослага насельніцтва. Станаўленне сістэмы адукацыі ў БССР. У. Пічэта. Даследаванні беларускага этнасу, яго гісторыі і культуры. Дзейнасць М. Шчакаціхіна. Літаратурная творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, З. Жылуновіча, М. Гарэцкага. Пачатак творчага шляху А. Куляшова. Станаўленне беларускага савецкага тэатра. Я. Міровіч, У. Галубок. Зараджэнне беларускага кіно. Ю. Тарыч. Выяўленчае мастацтва. М. Філіповіч, В. Волкаў.

**Правядзенне індустрыялізацыі ў БССР.** Пераход да планавай дзяржаўнай эканомікі. Прычыны і асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Формы працоўнай актыўнасці рабочага класа і іх уплыў на развіццё эканомікі. Вынікі індустрыялізацыі ў рэспубліцы.

**Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР.** Прычыны і асаблівасці правядзення калектывізацыі ў БССР. Пераход да суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі і фарсіраванне яе тэмпаў. Вынікі калгаснага будаўніцтва.

**Грамадска-палітычнае жыццё ў канцы 1920-х — 1930-я гг.** Роля КП(б)Б і Саветаў у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Складванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы. М. Галадзед, М. Гікала, А. Чарвякоў. Палітычныя рэпрэсіі. Канстытуцыя БССР 1937 г.

**Адукацыя і навука ў канцы 1920-х — 1930-я гг.** Змены ў сістэме адукацыі. Увядзенне ўсеагульнай пачатковай адукацыі. Развіццё навукі. Беларуская акадэмія навук. Навукоўцы — ураджэнцы Беларусі: даследаванні О. Шміта, адкрыцці А. Чыжэўскага.

**Развіццё літаратуры і мастацтва ў канцы 1920-х — 1930-я гг.** Асноўныя напрамкі і тэмы ў творчасці беларускіх пісьменнікаў: Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, П. Броўкі, М. Зарэцкага, П. Глебкі, М. Лынькова, К. Чорнага. Тэатральнае і музыч-

нае мастацтва. Станаўленне беларускіх оперы і балета. Архітэктура і скульптура: І. Лангбард, Г. Лаўроў, З. Азгур. Беларускі кінематограф: У. Корш-Саблін. Выяўленчае мастацтва: І. Ахрэмчык, І. Давідовіч, У. Кудрэвіч.

**Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы.** Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця беларускага насельніцтва. Асноўныя напрамкі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый. І. Лагіновіч. В. Харужая. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Б. Тарашкевіч.

**Стан культуры ў Заходняй Беларусі.** Адукацыя. Таварыства беларускай школы. Літаратура: П. Пестрак, М. Танк. Жывапіс: Я. Драздовіч, П. Сергіевіч. Музычнае мастацтва: Р. Шырма. М. Забэйда-Суміцкі. Праваслаўная царква і каталіцкі касцёл.

**Наш край**

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** беларусізацыя, каранізацыя, нацыянал-дэмакратызм, «прышчэпаўшчына», «крэсы ўсходнія», асаднікі, палітыка «санацыі».

## РАЗДЗЕЛ III
## БССР У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ І ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВОЙНАЎ
(11 гадзін)

**Беларусь у гады ваенных выпрабаванняў.** Пачатак Другой сусветнай вайны. Асноўныя этапы Вялікай Айчыннай вайны. Характар Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа.

**Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.** Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Устанаўленне савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Рашэнні Народнага сходу. С. В. Прытыцкі. Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі пасля аб’яднання з БССР. Гістарычнае значэнне ўз’яднання беларускага народа.

**Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.** Нападзенне нацысцкай Германіі на СССР. Мэты Германіі ў вайне супраць Савецкага Саюза. Абарончыя баі ў Беларусі і іх вынікі. Гераізм і патрыятызм савецкіх людзей. Акупацыя Беларусі германскай арміяй.

**Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.** План «Ост». Акупацыйны «новы парадак». Палітыка генацыду. Беларускія остарбайтары. Дзейнасць беларускіх калабарантаў.

**Пачатак масавай барацьбы супраць акупантаў.** Роля КП(б)Б у арганізацыі барацьбы народных мас з акупантамі. Стварэнне першых партызанскіх атрадаў. Антыфашысцкія патрыятычныя арганізацыі. Масавае супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму.

**Разгортванне народнай барацьбы на тэрыторыі Беларусі.** Стварэнне ЦШПР і БШПР. Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. Партызанскія зоны. «Рэйкавая вайна». Партыйнае і маладзёжна-камсамольскае падполле. Дапамога мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам. Антыфашысцкая барацьба ў заходніх раёнах Беларусі. Інтэрнацыянальны характар барацьбы з захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

**Вызваленне БССР ад германскіх захопнікаў.** Пачатак вызвалення Беларусі. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Узаемадзеянне партызанскіх фарміраванняў і войскаў Чырвонай Арміі. Акружэнне і разгром германскіх груповак. Вызваленне Мінска. Подзвігі савецкіх воінаў. Значэнне разгрому германскіх войскаў у Беларусі.

**Уклад беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй.** Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Удзел у еўрапейскім руху Супраціўлення. Працоўны гераізм у савецкім тыле.

**Удзел БССР у заснаванні ААН.** Савецкая стратэгія ў адносінах да ААН. Уключэнне БССР у склад краін — заснавальніц ААН. Выхад Беларусі на міжнародную арэну.

**Наш край**

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** «Віцебскія (Суражскія) вароты», план «Ост», генацыд, калабарацыянізм, остарбайтары, партызанскі рух, партызанскія зоны, падпольная барацьба, «рэйкавая вайна», Армія Краёва, аперацыя «Баграціён».

**Выніковае абагульненне** (1 гадзіна)

## СПОСАБЫ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ЗАСВОІЦЬ ВУЧНІ X КЛАСА:

лакалізоўваць падзеі сусветнай і айчыннай гісторыі ў часе і прасторы;

суадносіць гістарычныя падзеі, з'явы і працэсы айчыннай гісторыі з падзеямі, з'явамі і працэсамі еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

характарызаваць палітычнае становішча краін з апорай на гістарычную карту;

характарызаваць і ацэньваць дзейнасць палітычных і дзяржаўных дзеячаў і дзеячаў культуры;

раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць гістарычныя факты і рабіць на аснове гэтага аргументаваныя вывады;

параўноўваць гістарычныя факты па самастойна вызначаных крытэрыях;

тлумачыць розныя меркаванні на адны і тыя ж гістарычныя факты;

выказваць аргументаваны пункт погляду пры абмеркаванні гістарычных праблем;

праводзіць пошук гістарычнай інфармацыі ў крыніцах рознага тыпу;

выкарыстоўваць метады навучальнага гістарычнага даследавання: фармуляваць праблемы, ажыццяўляць збор, сістэматызацыю і абагульненне матэрыялу, праводзіць прэзентацыю вынікаў даследавання.

# XI КЛАС

## СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ: ДРУГАЯ ПАЛОВА 1940-х гг. — ПАЧАТАК XXI ст.

**(35 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)**

### Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін свету пасля Другой сусветнай вайны (1 гадзіна)

Раскол пасляваеннага свету. Фарміраванне двухполюснага свету. Асноўныя этапы і тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця заходніх краін. Роля НТР у сусветным развіцці. Глабалізацыя свету. Глабальныя праблемы сусветнага развіцця.

Савецкая мадэль сацыялізму: асноўныя дасягненні і праблемы. Крах «рэальнага сацыялізму» ў еўрапейскіх краінах. Распад СССР і яго наступствы.

Узнікненне новых масавых рухаў. Ліквідацыя сістэмы каланіялізму. «Трэці свет». Павышэнне ролі ўсходніх цывілізацый у сучасным развіцці свету.

***Асноўныя паняцці:*** двухполюсны свет, навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР), глабалізацыя, глабальныя праблемы, савецкая мадэль сацыялізму, сусветная сістэма сацыялізму, краіны «трэцяга свету».

### РАЗДЗЕЛ I
### АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ЗША І КРАІН ЕЎРОПЫ
### (12 гадзін)

**Фарміраванне і крызіс грамадства «ўсеагульнага дабрабыту» ў краінах Захаду.** Пасляваеннае аднаўленне эканомікі і трансфармацыя эканамічнай мадэлі. «Агульны рынак». НТР і яе сацыяльна-эканамічныя наступствы. Дзяржаўнае рэгуля-

ванне эканомікі і яго асаблівасці ў развітых краінах. Дактрына сацыяльнага лібералізму. Грамадства «ўсеагульнага дабрабыту». Крызіс кейнсіянскай мадэлі сацыяльна-эканамічнага рэгулявання. Рост невытворчай сферы. Энергетычная праблема. Сусветны эканамічны крызіс 1974—1975 гг. і яго наступствы. Неакансерватыўная хваля ў 1980—1990-я гг.

**Пераход развітых краін Захаду да постіндустрыяльнага грамадства.** Асноўныя рысы постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. Інфармацыйная рэвалюцыя і яе наступствы. Глабалізацыя сусветнай эканомікі. Праблемы інтэграцыі. Змены ў сацыяльнай структуры. Нарастанне крызісных з'яў у развіцці постіндустрыяльнага грамадства ў пачатку XXI ст. Сусветны фінансава-эканамічны крызіс і яго наступствы.

**Злучаныя Штаты Амерыкі.** Сацыяльна-эканамічнае становішча пасля Другой сусветнай вайны. Макартызм. Прэзідэнцтва Д. Эйзенхаўэра. Ваенна-прамысловы комплекс. Палітыка Дж. Кенэдзі і Л. Джонсана. Сацыяльна-палітычнае развіццё ў 1970-я гг. ЗША ў перыяд прэзідэнцтва Р. Рэйгана. Сацыяльна-эканамічная палітыка адміністрацыі Б. Клінтана. ЗША ў канцы XX — пачатку XXI ст. Палітыка адміністрацыі Дж. Буша і Дж. Буша-мал. Прыход да ўлады Дэмакратычнай партыі. Прэзідэнт Б. Абама.

**Федэратыўная Рэспубліка Германія і Германская Дэмакратычная Рэспубліка.** Утварэнне ФРГ і ГДР. Германскі «эканамічны цуд». Палітычнае развіццё ФРГ. Будаўніцтва сацыялізму ў ГДР. Берлінскі крызіс 1961 г. Сацыяльна-палітычнае развіццё ФРГ і ГДР у 1970—1980-я гг. Г. Коль. Аб'яднанне Германіі. ФРГ у 1990-я гг. Прыход да ўлады А. Меркель.

**Вялікабрытанія.** Пачатак распаду Брытанскай каланіяльнай імперыі. Унутраная і знешняя палітыка кансерватараў (1951—1964). Ірландская (Ольстэрская) праблема і шляхі яе вырашэння. Кансерватары і лейбарысты перад эканамічнымі праблемамі 1970-х гг. Палітыка кансерватараў. М. Тэтчар. «Тэтчарызм». Вяртанне лейбарыстаў да ўлады.

**Францыя.** Ш. дэ Голь. Фарміраванне рэжыму Чацвёртай рэспублікі. Пачатак распаду Французскай каланіяльнай імперыі. Пятая рэспубліка. Знешняя палітыка. Эканамічны ўздым у Францыі ў канцы 1950-х — 1960-я гг. Палітычны

крызіс 1968 г. Францыя пасля дэ Голя. Палітыка Францыі ў перыяд прэзідэнцтва Н. Сарказі.

**Італія.** Пасляваенныя дэмакратычныя пераўтварэнні. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ў 1950—1980-я гг. Праблема Поўдня. Палітычны тэрарызм. Пошукі шляхоў выхаду з палітычнага крызісу. Палітычныя змены ў 1990-я гг. — пачатку XXI ст. С. Берлусконі.

**Краіны Паўночнай Еўропы.** Агульныя рысы і асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця пасля Другой сусветнай вайны. Палітычнае развіццё пасля 1945 г. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Швецыі.

**Краіны Усходняй Еўропы.** Дэмакратычныя пераўтварэнні першых пасляваенных гадоў. Утварэнне Савета Эканамічнай Узаемадапамогі (СЭУ). Поспехі і цяжкасці сацыялістычнага будаўніцтва. Нарастанне сістэмнага крызісу сацыялізму. Дэмакратычныя рэвалюцыі 1989—1991 гг. Распад Югаславіі і яго наступствы. Утварэнне Чэшскай і Славацкай рэспублік. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў канцы XX — пачатку XXI ст. Інтэграцыя ў еўрапейскія структуры і НАТА.

**Культура ЗША і краін Еўропы. Лад жыцця насельніцтва.** Развіццё навукі і сістэмы адукацыі. Асноўныя напрамкі развіцця мастацкай культуры ў другой палове XX ст. Постмадэрнізм. Камерцыялізацыя мастацкай творчасці. Моладзёжная контркультура. Рок- і поп-музыка. Шоу-бізнес і рэклама. Літаратура і тэатр: асноўныя тэндэнцыі развіцця. Архітэктура. Змены ў грамадскай свядомасці. Лад жыцця і матэрыяльнае становішча сярэдняга класа. Масавая культура. Рост уплыву сродкаў масавай інфармацыі.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** грамадства «ўсеагульнага дабрабыту», «агульны рынак», інтэграцыя, СЭУ, ЕС, «макартызм», транснацыянальныя карпарацыі, ваенна-прамысловы комплекс (ВПК), «рэйганоміка», «тэтчарызм», «галізм», неакансерватыўная хваля, «шведская мадэль», «будапешцкая восень», «пражская вясна», «аксамітныя рэвалюцыі», постіндустрыяльнае (інфармацыйнае) грамадства, постмадэрнізм.

## РАЗДЗЕЛ II
## ГІСТОРЫЯ СССР І РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ (8 гадзін)

**СССР у 1945—1953 гг.** Пераход народнай гаспадаркі на мірны шлях развіцця. Аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі. Палітычнае развіццё краіны. Барацьба з касмапалітызмам.

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё СССР у 1953—1964 гг.** Змены ў палітычным курсе краіны пасля смерці І. В. Сталіна. ХХ з'езд КПСС. Крытыка культу асобы Сталіна. М. С. Хрушчоў. Грамадска-палітычнае жыццё ў краіне. Сацыяльна-эканамічныя рэформы. Жыццё і побыт савецкіх людзей. ХХІІ з'езд КПСС і яго рашэнні. Грамадскае і палітычнае жыццё краіны пасля з'езду. Адхіленне ад улады М. С. Хрушчова.

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё СССР у сярэдзіне 1960-х — пачатку 1980-х гг.** Асаблівасці палітычнага жыцця савецкай краіны. Л. І. Брэжнеў. Канстытуцыя СССР 1977 г. Грамадскае жыццё. Эканамічныя рэформы. Паніжэнне тэмпаў развіцця. Стан сельскай гаспадаркі ў 1970-я — пачатку 1980-х гг. Харчовая праблема. Абвастрэнне эканамічнага становішча. Паўсядзённае жыццё савецкіх людзей.

**Распад СССР і стварэнне СНД.** Палітыка перабудовы. М. С. Гарбачоў. Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Новыя з'явы ў палітычным жыцці краіны. Галоснасць. Чарнобыльская аварыя. Дэмакратызацыя сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця. Праблема падпісання саюзнага дагавора. Падзеі жніўня 1991 г. Б. М. Ельцын. Распад СССР і стварэнне СНД.

**Расійская Федэрацыя і СНД.** Падзеі верасня—кастрычніка 1993 г. і іх наступствы. Сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны. Унутраная палітыка прэзідэнта У. У. Пуціна. Вайна ў Чачні. Праблема ўмацавання расійскай дзяржаўнасці. Палітычная сістэма сучаснай Расіі. Расійска-беларуская інтэграцыя. Дзяржавы СНД і іх развіццё. Інтэграцыйныя працэсы ў межах СНД. Утварэнне АДКБ, ЕўрАзЭС. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця. Узброеныя канфлікты ў СНД. «Каляровыя рэвалюцыі».

**Навука і культура.** Асаблівасці і праблемы развіцця культуры. Савецкая атамная праграма. Навука і космас. Дасягненні савецкай навукі і яе ўклад у развіццё сусветнай цывілізацыі. Літаратура, мастацтва і музыка. Дысідэнцкі рух. Ажыўленне духоўнага жыцця. Ідэалы і каштоўнасці савецкага грамадства. Развіццё культуры ў Расійскай Федэрацыі.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** дэсталінізацыя, дэмакратызацыя, валюнтарызм, інтэнсіўны шлях развіцця гаспадаркі, экстэнсіўны шлях развіцця гаспадаркі, разрадка, стагнацыя, перабудова, галоснасць, новае палітычнае мысленне, Белавежскае пагадненне, Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД).

## РАЗДЗЕЛ III
## КРАІНЫ АЗІІ І ПАЎНОЧНАЙ АФРЫКІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (8 гадзін)

**Распад каланіяльнай сістэмы.** Ідэалогія нацыянальна-вызваленчага руху. Утварэнне незалежных дзяржаў. Праблема выбару шляхоў развіцця. Неакаланіялізм. Сацыялістычная арыентацыя краін Азіі і Афрыкі. СССР і «трэці свет».

**Кітайская мадэль развіцця.** Утварэнне Кітайскай Народнай Рэспублікі (КНР). Аднаўленчы перыяд. Савецка-кітайскія адносіны. Палітыка «вялікага скачка» і «культурнай рэвалюцыі». Рэфармаванне кітайскага грамадства пасля смерці Мао Цзэдуна. Дэн Сяопін. Культура КНР.

**Японская мадэль развіцця.** Рэформы 1945—1949 гг. Сан-Францыскі дагавор. «Эканамічны цуд». Унутрыпалітычная барацьба ў 60—70-я гг. ХХ ст. Сучаснае становішча Японіі (канец ХХ — пачатак ХХІ ст.). Японская культура.

**Індыйская мадэль развіцця.** Барацьба індыйскага народа за незалежнасць. Утварэнне дамініёна і рэспублікі. «Курс Нэру». Барацьба за працяг «курсу Нэру». І. Гандзі. Р. Гандзі. Палітычная нестабільнасць у 1990-я гг. Прыход да ўлады Індыйскай народнай партыі (БДП). Вяртанне да ўлады Індыйскага нацыянальнага кангрэса (ІНК). Духоўная культура краіны.

**Сацыяльна-палітычнае развіццё і культура краін мусульманскага свету.** Нацыянальна-вызваленчыя рэвалюцыі. Ісламская рэвалюцыя ў Іране. Мадэрнізацыя ісламскіх краін (Турцыя, Егіпет). Ісламскі фундаменталізм. Праблема тэрарызму. Развіццё культуры.

**Краіны Лацінскай Амерыкі.** Лацінаамерыканскі вопыт мадэрнізацыі. Дыктатарскія рэжымы і ваенныя хунты. Бразільскі «эканамічны цуд». Перанізм і дэмакратыя ў Лацінскай Амерыцы. Сучасны этап развіцця і інтэграцыйныя працэсы. Развіццё культуры.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** краіны «трэцяга свету», дэкаланізацыя, «год Афрыкі», дзяржаўны сацыялізм, неакаланіялізм, «культурная рэвалюцыя» ў Кітаі, мааізм, палітыка «вялікага скачка», дамініён, «курс Нэру», Рух недалучэння, новыя індустрыяльныя краіны, лакальныя войны і канфлікты, глабалізацыя, ісламскі фундаменталізм, тэрарызм.

## РАЗДЗЕЛ IV
## МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ І ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СВЕТУ (4 гадзіны)

**Фарміраванне біпалярнага свету і пачатак глабальнага процістаяння (1945—1950-я гг.).** Ваенна-палітычныя вынікі Другой сусветнай вайны. Парыжская мірная канферэнцыя (1946). Эканамічная стабілізацыя. Прычыны «халоднай вайны». Палітыка «стрымлівання». Дактрына Трумэна. План Маршала. Раскол Германіі. Стварэнне НАТА і АВД. Процістаянне ЗША — СССР. Крызіс каланіяльнай сістэмы. Карэйская вайна. Канферэнцыя ў Сан-Францыска (1951). Індакітайскі канфлікт. Нарада міністраў замежных спраў у Жэневе (1954) і яе вынікі. Суэцкі крызіс (1956) і яго міжнародныя наступствы.

**Змяненне суадносін сіл у сусветнай палітыцы і новыя рысы процістаяння паміж Усходам і Захадам (1960—1970-я гг.).** Праблема Заходняга Берліна. Карыбскі крызіс (1962) і яго

вынікі. Дагавор 1963 г. аб забараненні ядзерных іспытаў у трох асяроддзях (атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой). Савецка-французскія адносіны ў 1960-я гг. Вайна ў В'етнаме. Вайна на Бліжнім Усходзе. Гонка ўзбраенняў і яе наступствы. Абмежаванне стратэгічных узбраенняў. Дагаворы ФРГ з краінамі ўсходняга блока (1970—1973). Хельсінская Нарада па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе і яе вынікі. Савецка-амерыканскія пагадненні ў 1970-я гг. Вынікі разрадкі міжнароднай напружанасці.

**Міжнародныя адносіны ў 1980-я гг. — пачатку XXI ст. Крах біпалярнага свету.** Абвастрэнне міжнародных адносін у першай палове 1980-х гг. Вайна ў Афганістане. Крызіс у Польшчы. Р. Рэйган і пагаршэнне савецка-амерыканскіх адносін. Новае палітычнае мысленне. Савецка-амерыканскі дыялог (1985—1989) і яго вынікі. Распад СССР. Геапалітычныя наступствы дэзінтэграцыі постсацыялістычнай прасторы. Пашырэнне НАТА. Праблема стварэння новай сістэмы еўрапейскай і сусветнай бяспекі. Фактары нестабільнасці ў сучасных міжнародных адносінах. Лакальныя канфлікты і войны. Роля ААН у сучасным свеце.

**Глабальныя праблемы чалавецтва.** Праблема фарміравання мнагаполюснага свету. Праблема міжнароднага тэрарызму: прычыны ўзнікнення, формы, шляхі процідзеяння. Праблема абмежавання і нераспаўсюджвання ядзернай зброі. Пошукі шляхоў рашэння экалагічнай праблемы. Праблема выкарыстання прыродных рэсурсаў. Альтэрнатыўныя крыніцы энергіі. Праблема выкарыстання дасягненняў НТР: новых біятэхналогій, геннай інжынерыі, штучнага інтэлекту, кланіравання. Праблема барацьбы са СНІДам, новымі вірусамі і хваробамі.

***Асноўныя паняцці:*** план Маршала, дактрына Трумэна, НАТА, АВД, «халодная вайна», карыбскі крызіс, Рух недалучэння, новая ўсходняя палітыка, берлінскі крызіс, «будапешцкая восень», «пражская вясна», хельсінскі працэс, разрадка міжнароднай напружанасці, новае палітычнае мысленне, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН).

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: ДРУГАЯ ПАЛОВА 1940-х гг. — ПАЧАТАК XXI ст.

**(35 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час)**

## РАЗДЗЕЛ І
## БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1950-х гг.
(6 гадзін)

**БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.** Сацыяльна-эканамічнае аднаўленне краіны ў пасляваенны перыяд. Народны энтузіязм. Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця. Развіццё культуры.

**Пераадоленне наступстваў вайны ў галіне эканомікі. Выхад на новы ўзровень развіцця.** Людскія і матэрыяльныя страты ў гады вайны і фашысцкай акупацыі. Аднаўленне і развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту і сувязі ў гады чацвёртай пяцігодкі. Працоўны подзвіг беларускага народа. Курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці ў гады пятай пяцігодкі. Пасляваенная індустрыялізацыя БССР: яе асаблівасці і вынікі. Меры па аднаўленні сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі.

**Грамадска-палітычнае жыццё БССР.** Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця. Месца Камуністычнай партыі Беларусі ў грамадска-палітычнай сістэме. Роля Саветаў, прафсаюзаў, камсамола ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Партыйна-дзяржаўныя кіраўнікі: П. К. Панамарэнка, В. І. Казлоў. Адносіны дзяржавы і царквы.

**Адраджэнне і развіццё адукацыі і навукі ў БССР у пасляваенны перыяд.** Увядзенне ўсеагульнага 7-гадовага навучання. Вышэйшая, сярэдняя спецыяльная і прафесійна-тэхнічная школа Беларусі ў першыя пасляваенныя гады. Беларуская навука. Прэзідэнт АН БССР В. Ф. Купрэвіч.

**Літаратура і мастацтва.** Тэма вайны, асвятленне мірнага жыцця ў Беларусі ў пасляваенныя гады ў творах Я. Брыля, Я. Коласа, М. Лынькова, І. Мележа, І. Шамякіна. Творчасць П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка. Беларускі тэатр. Музычнае жыццё. Выяўленчае мастацтва.

**Урок абагульнення**

***Асноўныя паняцці:*** пасляваеннае аднаўленне, рэпатрыяцыя, прынцып партыйнасці.

## РАЗДЗЕЛ II
## **БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1950-х — 1980-я гг.** (12 гадзін)

**Беларусь ва ўмовах рэфармавання грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця.** Курс на рэфармаванне грамадства ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг. Узмацненне ролі партыйных органаў і ўсталяванне кансерватызму ў кіраўніцтве краінай. Паступовае зніжэнне тэмпаў гаспадарчага развіцця. Прыняцце курсу на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця ў перыяд перабудовы.

**Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.** Змены ў грамадска-палітычным жыцці («адліга»). Кіруючая роля камуністычнай партыі. Курс на будаўніцтва камуністрычнага грамадства. К. Т. Мазураў. Саветы дэпутатаў працоўных, камсамол, прафсаюзы у грамадска-палітычным жыцці. Палітыка дзяржавы ў адносінах да царквы.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.** Развіццё машынабудавання і металаапрацоўкі, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. Фарміраванне прамысловага комплексу БССР. Вынікі развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі. К. П. Арлоўскі. Умовы жыцця сельскага і гарадскога насельніцтва.

**Грамадска-палітычнае становішча ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.** Грамадска-палітычная сістэма, яе характар. Грамадскія арганізацыі і аб'яднанні. П. М. Машэраў.

**Сацыяльна-эканамічнае становішча ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.** Асноўныя прынцыпы эканамічнай рэформы 1965 г. Прамысловае развіццё рэспублікі ў 1970-я — першай палове 1980-х гг. Сельская гаспадарка: меліярацыя і хімізацыя, будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых комплексаў. Замаруджванне тэмпаў росту эканомікі і сацыяльнай сферы ў першай палове 1980-х гг. Узровень жыцця народа.

